WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ЛЮТАГА 2010 г.
АЎТОРАК
№ 33
(26641)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ! ПАВАЖАНЫЯ ВЕТЭРАНЫ, САЛДАТЫ І АФІЦЭРЫ!

Віншую вас са святам — Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь.

У год 65-годдзя Вялікай Перамогі асаблівай пашаны заслугоўваюць ветэраны. Ваш баявы шлях авеяны нязгаснай славай. Вашы подзвігі назаўсёды ўпісаныя ў гісторыю беларускай дзяржавы. У жорсткіх бітвах вы выратавалі Радзіму, самаддана абаранілі ад фашысцкага прыгнёту іншыя краіны, падарылі свету жыццё і свабоду.

Сёння новыя пакаленні абаронцаў Айчыны годна працягваюць ратныя подзвігі герояў-пераможцаў Вялікай Айчыннай вайны, з гонарам выконваюць свой абавязак.

Звяртаючыся ў гэты святочны дзень, які ўвасабляе сувязь пакаленняў, да ўсіх, хто добрасумленна нясе службу ў радах Узброеных Сілаў або знаходзіцца ў рэзерве, выказваю ўдзячнасць за адданасць прысязе і воінскаму абавязку.

Перакананы ў тым, што беларуская армія надзейна забяспечыць чыстае неба над нашай цудоўнай зямлёй.

Жадаю вам моцнага здароўя, бадзёрасці духу, любові і павагі родных і блізкіх, поспехаў у бескарыслівым служэнні Рэспубліцы Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41 «ЧАМУ ЗА РАСЧЫСТКУ СНЕГУ ЛЮДЗЯМ ЗАПЛАЦІЛІ БОЛЬШ, ЧЫМ ЗА МЕСЯЦ ПРАЦЫ — ТРАКТАРЫСТУ?»

Юлія Анатольеўна Лебедзева з вёскі Колбча Клічаўскага раёна зараз знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці. Асноўным карміцелем сям'і выступае муж Сяргей Міхайлавіч Перуноўскі, які працуе ў мясцовым СВК «Савецкая Беларусь» трактарыстам. Працаваць працуе, толькі вось з заробкамі — бяда.

— За снежань у студзені муж атрымаў 100 тысяч рублёў. За студзень у лютым і таго менш — 40 тысяч. Скажыце, хіба ж гэта грошы, калі ў сям'і двое дзяцей? Ці павінны мужу даплачваць да мінімальнага пражытковага мінімуму? У іншых гаспадарках па суседстве, ведаю, даплачваюць, — гаварыла Юлія Анатольеўна. — Кажуць, расцэнкі маленькія. Але ж ён на працу штодня ходзіць. А тут неяк дахі ад снегу ачышчалі, дык людзям па 150 тысяч рублёў заплацілі...

Праверыць выкладзеныя заяўніцай факты мы папрасілі **галоўнага эканаміста СВК «Савецкая Беларусь» Людмілу ПАДЖЫГЕРАВУ**. Вось што ў выніку пачулі.

— Напачатку колькі тэорыі. Згодна з калектыўным дагаворам, даплата да пражытковага мінімуму адбываецца пры ўмове выканання нормы працоўнага часу, нормы нагрузкі і нормы вытворчасці. Гаспадарка сама вызначае ў халодную пару года, калі працы менш у сувязі з сезонным характарам вытворчасці, норму працоўнага часу. За снежань і студзень (люты ж яшчэ не скончыўся) яна была вызначана ў памеры 119 гадзін, або 17 дзён на кожны месяц, — патлумачыла Людміла Серафімаўна. — Цяпер пяройдзем да практыкі. У трактарыста Перуноўскага за снежань было 10 пуцявых лістоў — гэта 60 гадзін. За іх налічана 89 177 рублёў. Дзелім гэтую суму на колькасць гадзін, атрымліваем 1486 рублёў за гадзіну. Аднак у снежні трактарыст 6 дзён (35 гадзін па табелі) быў на рамонце. За гэта налічана 24 160 рублёў. А за ўсе адпрацаваныя 95 гадзін — 113 377 рублёў. Норма, нагадаю, складала для снежня 119 гадзін. Калі б яна была выкананай, ішла б даплата — 1486 рублёў за гадзіну. Чаму ў работніка так атрымалася з нормай працоўнага часу, у мяне аб'ектыўных звестак няма.

Як распавяла далей Людміла Паджыгерава, за студзень трактарыст здаў 3 пуцявыя лісты. Гэта 14 гадзін (або па 4,6 гадзіны ў дзень), або 17 323 рублі — па грашах. Яшчэ 8 дзён — рамонт (па 5 гадзін у дзень, бо было вельмі холадна, і больш працаваць на марозе з металам нерэальна). Значыць, за гэтыя 40 гадзін — 29 тысяч. Такім чынам, за першы месяц года выходзіць 54 гадзіны працоўнага часу пры норме зноў жа 119 гадзін. Адпаведна, налічаны заробак «бруднымі» склаў 46 323 рублі. Як вынікае, падстаў для даплаты няма...

— У студзені, напрыклад, было 7 выхадных дзён. 31 мінус сем, выходзіць 24 працоўныя дні. Але, улічваючы сезонны характар вытворчасці (летам часам і без выхадных працуюць), было вызначана: трэба адпрацаваць хоць бы 17, — дадала Людміла Серафімаўна. — Зноў жа, у мяне адсутнічаюць аб'ектыўныя звесткі, чаму ў работніка так атрымалася.

Што датычыцца аплаты за расчыстку снегу, галоўны эканаміст СВК патлумачыла наступнае. З-за моцных снегападаў была складаная сітуацыя. На адной з фермаў на кароўніку часткова быў пашкоджаны дах, таму трэба было тэрмінова вызваляць яго ад гэтага покрыва. Запрашаліся любыя ахвотныя работнікі з самой гаспадаркі. Была вызначана расцэнка: за адзін расчышчаны ліст шыферу — 340 рублёў.

— Работа ішла вельмі цяжка, першая брыгада нават адмовілася працаваць далей. Іншым, магчыма, паспрыялі ўмовы надвор'я, але некаторыя паспелі расчысціць значныя плошчы. А ім жа была даведзена расцэнка, давялося заплаціць, — расказала галоўны эканаміст гаспадаркі. — З іншага боку, людзі на расчыстцы працавалі розную колькасць дзён і, выходзячы з нормы выпрацоўкі, і зарабілі па-рознаму. Вось, адзін чалавек за пяць дзён працы атрымаў 138 тысяч, другі за той жа перыяд — 217 тысяч, хтосьці адпрацаваў адзін дзень і атрымаў 20 тысяч рублёў. За адзін працоўны дзень па ачыстцы максімальна на аднаго чалавека было зароблена 70 тысяч.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Беларусь у найбліжэйшай перспектыве можа павялічыць здабычу нафты ў Венесуэле ў 10 разоў

да 150—200 тыс. барэляў за суткі супраць цяперашніх 14 тыс. барэляў за суткі. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Рэспубліцы Беларусь Амерыка Дыяс Нуньес, адказваючы на пытанне карэспандэнта **БЕЛТА**.

Сусветны крызіс не аказаў істотнага ўплыву на беларуска-венесуэльскія сувязі, паколькі ўрады дзвюх краін своечасова прынялі меры па змякчэнні яго наступстваў.

Венесуэла гатова паставіць на НПЗ Беларусі першыя 500 тыс. барэляў сырой нафты пры ўмове рэнтабельнасці праекта.

Беларусь і Венесуэла вывучаюць магчымасць сумеснай вытворчасці растваральнай кавы на венесуэльскай фабрыцы «Кафеа». Разглядаецца таксама магчымасць пастаўкі ў Беларусь такіх венесуэльскіх прадуктаў, як какава, алей какавы, трапічныя плады, сухафрукты.

Беларусь і Венесуэла вывучаць магчымасць стварэння СП па выпуску абсталявання для перапрацоўкі ў Венесуэле звадкаванага нафтавага газу ў маторнае паліва.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ ПРЭЗІДЭНТУ ПАРТУГАЛІІ Ў СУВЯЗІ З АХВЯРАМІ ПАВОДКІ НА ВОСТРАВЕ МАДЭЙРА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Партугальскай Рэспублікі Анібалу Каваку Сілве ў сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі, выкліканымі моцнай паводкай на востраве Мадэйра, а таксама родным і блізкім загінулых.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

АРМЕЙСКАЕ ВОГНІШЧА

Ваеннаслужачыя вайсковых частак, якія базіруюцца ў Старых Дарогах, у перадсвяточны дзень каля лясного вогнішча.

МІНІСТРЫ І КІРАЎНІКІ ЗНОЎ СТАЛІ НА ЛЫЖЫ

На «Мінскай лыжні-2010» перамагла каманда Прэзідэнта

У суботу ў Раўбічах на базе Цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту прайшло традыцыйнае спартыўнае свята «Мінская лыжня-2010». У спаборніцтвах узялі ўдзел кіраўнікі шматлікіх міністэрстваў і ведамстваў, а ў эстафеце камандаў дзяржорганаў на старт выйшаў Аляксандр Лукашэнка. Перамагла, дарэчы, у гэтай эстафеце каманда кіраўніка дзяржавы.

Нягледзячы на адлігу і дождж, які перыядычна накрапваў, каля дзясятка тысяч аматараў здаровага ладу жыцця прыехалі ў Раўбічы. Напярэдадні супрацоўнікі ДАІ заклікалі скарыстацца грамадскім транспартам, аднак многія мінчане аддалі перавагу ўласнаму — з раніцы былі занятыя і стаянкі, і месцы ўздоўж дарогі. Падтрымка ўсім удзельнікам лыжні была забяспечаная. Першымі на старт выйшлі сямейныя каманды, якія выступалі за розныя раёны сталіцы — сёлета іх было 18. Дарэмна казаць, што ўсе ўдзельнікі эстафеты абраныя невыпадкова. Як прызнаваліся ўдзельнікі сямейных камандаў, да спаборніцтваў яны рыхтаваліся спецыяльна, напрыклад, на трасе ў Вяснянцы. А перамогу святкавала сямейнае трыа Чарнышовых з Савецкага раёна сталіцы.

Затым на старт выйшлі каманды органаў дзяржкіравання. 47 камандаў былі падзеленыя на тры групы — А, В і С. У групе А спаборнічала 11 наймацнейшых камандаў: кіраўніка дзяржавы, Службы бяспекі Прэзідэнта, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства абароны, Міністэрства па падатках і зборах, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства спорту і турызму, Камітэта дзяркантролю і КДБ, Дзяржпагранкамітэта і Мытнага камітэта. Паводле правілаў спаборніцтваў, кіраўнік міністэрства або ведамства павінен замыкаць эстафету. На трэцім этапе абавязкова павінна ўдзельнічаць жанчына. У камандзе кіраўніка дзяржавы на старт на першых трох этапах выйшлі Уладзімір Чапелін, Сяргей Булыгін і Людміла Ананька. На ўсіх этапах каманда Прэзідэнта лідзіравала, прычым з адрывам. Фінішаваўшы на чацвёртым этапе, Аляксандр Лукашэнка прынёс сваёй камандзе «золата». Пераможцы паказалі выдатны вынік эстафеты — 23 хвіліны 11 секундаў. На другім месцы аказалася каманда Міністэрства спорту і турызму, трэцімі на п'едэстале сталі прадстаўнікі Міністэрства абароны.

Пасля фінішу Аляксандр Лукашэнка падзяліўся сваімі ўражаннямі, у тым ліку выказаў сваё меркаванне наконт выступлення беларускіх спартсменаў на Алімпіядзе ў Ванкуверы. Кіраўнік дзяржавы станоўча ацаніў выступленне медалістаў, у той жа час пакрытыкаваў вынікі, якія паказваюць беларускія атлеты. «Я гляджу на Алімпійскія гульні не з пункту погляду медалёў. Медалі — гэта добра. Але я гляджу глыбей: мы не паказалі тых вынікаў, якія павінны былі паказаць з улікам таго, колькі ўвагі ў нашай краіне надаецца спорту», — цытуе БЕЛТА кіраўніка дзяржавы. «Не павінна было быць такога правалу ў хакеі. Нашы хакеісты гуляюць вельмі дрэнна, няроўна, гледзячы па ўсім, гэта недапрацоўкі трэнерскага штаба, федэрацыі хакея», — выказаў меркаванне Аляксандр Лукашэнка. «Зусім дрэнна працуюць лыжнікі. І гэта не першы год мы правальваем лыжню. Няма сістэмнага падыходу. Няўжо нельга было адабраць 20—30 здольных лыжнікаў? Цяпер паглядзім на фрыстайл. Калі суддзі паставяцца з прыхільнасцю, магчыма штосьці і заваюем», — прыводзіць БЕЛТА словы кіраўніка дзяржавы. У той жа час Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што падобнае выступленне ў Ванкуверы ён прадбачыў, але спадзяваўся на лепшае. «Вось гэта лепшае і адбылося ў біятлоне», — сказаў ён. У той жа час Прэзідэнт выказаў думку, што беларускі спорт здатны дэманстраваць больш яскравыя вынікі ва ўсіх відах, а выступленне ў Ванкуверы — нагода для сур'ёзнага аналізу і канкрэтных высноў.

Спаборніцтвы ў групе В і С прайшлі ў больш спакойным тэмпе — было заўважна, што тут не так шмат прафесіяналаў лыжні. Некаторыя кіраўнікі замыкаць эстафету тут даручылі намеснікам, але большасць міністраў справай гонару палічылі самім стаць на лыжы. Сярод іх былі і міністр гандлю Валянцін Чаканаў, міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў, міністр ЖКХ Уладзімір Белахвостаў, міністр аховы здароўя Васіль Жарко. У групе В удзельнічалі прадстаўнікі Савета Міністраў, дэпутаты, каманды Адміністрацыі Прэзідэнта, Генпракуратуры, Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, Савета Бяспекі, Нацбанка, Канстытуцыйнага Суда, Вярхоўнага суда, Вышэйшага Гаспадарчага Суда і БФСТ «Дынама». Дынамаўцы, дарэчы, праявілі свой сапраўдны характар і лідзіравалі з самага пачатку, заваяваўшы «золата». На другім месцы — Нацбанк, за імі Генпракуратура. У групе С Міністэрства адукацыі святкавала перамогу, на другім месцы — Міністэрства гандлю, трэцяе месца заняў «Беларусбанк».

Але для большасці наведвальнікаў Раўбічаў гэты выхадны стаў не спаборніцтвамі, а святам удалечыні ад гарадской мітусні: шашлыкі на свежым паветры і вялікая культурна-забаўляльная праграма, прадэманстраваная мастацкімі калектывамі Мінскай вобласці. Гэта і конкурс спорту і прыгажосці «Тыгрыца года», забаўляльныя эстафеты на санках «Хуткія, лоўкія, умелыя» і «Гонкі з мячамі», конкурсы «Беларускія асілкі-2010», «Спартыўнае кола», спаборніцтвы «Шарадуў» і «Снегавік».

Алена КРАВЕЦ.

Фота БЕЛТА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

УЗНАГАРОДА ЗНАЙШЛА КРЫЧАЎСКАГА ГЕРОЯ

Сын ветэрана атрымаў ордэн Славы, які належыць бацьку, праз 66 гадоў.

Івана Іванавіча МАГІЛЁЎЦАВА памятаюць у Крычаве: работнік цэментнага завода стаў Героем Сацыялістычнай Працы. Цяпер яго сыну Валерыю ўручылі пры пасрэдніцтве Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Беларусі ордэн Славы III ступені і пасведчанне, якое падпісана Дзмітрыем Мядзведзевым. Сам ветэран не дажыў да гэтага дня.

Як паведамілі ў Крычаўскім ваенкамаце, Іван Магілёўцаў павінен быў атрымаць высокую ўзнагароду яшчэ ў 1944 годзе. Падчас фарсіравання Віслы і Одэра ён злавіў нямецкага «языка» і дапамог атрымаць інфармацыю аб размяшчэнні варожых войскаў на іншым беразе.

Ілона ІВАНОВА.

У ОФІС ПА... СЦЕНАХ

Жыхар Слуцкага раёна забіраўся ў памяшканні праз вокны, а крадзенае адтуль дабро выкідваў у гурбы снегу.

Такі спосаб «заробку» падаўся 23-гадоваму крымінальніку найбольш прымальным, і ён, паводле звестак **прэс-афіцэра Маскоўскага РУУС Таццяны ГРЫБ,** паспеў «абчысціць» некалькі офісных памяшканняў у сталіцы, пакуль не быў затрыманы праваахоўнікамі. Першым у яго спісе стаў офіс на вуліцы Розы Люксембург, які месціцца на другім паверсе будынка: спрытна скарыстаўшы выступы на сценах, злодзей, адчыніўшы акно, прабраўся ўсярэдзіну. Пад покрывам ночы ён выкінуў у гурбу снегу аргтэхніку — перавагу аддаваў ноўтбукам, маніторам і радыётэлефонам. Потым скрадзеную тэхніку спрытнюга хутка збыў на рынку, а грошы, зразумела ж, патраціў на сябе. Паспяховасць, з якой удалося здзейсніць злачынства, літаральна акрыліла: у выніку падобным чынам ён абакраў яшчэ некалькі офісаў ужо на згаданай вуліцы, а таксама на 3-м Загарадным завулку. Між іншым, усе памяшканні знаходзіліся на другім паверсе, а вокны не былі абсталяваныя ні кратамі, ні ахоўнай сігналізацыяй. Супрацоўнікам міліцыі спатрэбілася каля месяца, каб раскрыць гэтыя злачынствы. Злодзей, дарэчы, раней судзімы за крадзяжы, быў затрыманы па месцы жыхарства.

Ігар ГРЫШЫН.

ДОМ РАЗБУРЫЎ ВЫБУХ

Выбух газу ў прыватным сектары Гомеля цалкам разбурыў жылы дом. Ён быў такім моцным, што сцены дома з бярвення склаліся. Пад завал трапілі тры чалавекі.

Можна лічыць цудам, што ніхто з іх не пацярпеў сур'ёзна. У адным з пакояў знаходзіліся пенсіянерка, яе нявестка і 7-гадовая ўнучка. Яны самастойна выбраліся з-пад абвалення бэлек і адмовіліся ад медыцынскай дапамогі. Пакуль што жыхары разбуранага дома знайшлі прытулак у суседзяў. Вядома, што летась у лістападзе да дома падвялі прыродны газ. Хутчэй за ўсё, адбылася яго ўцечка, але ж спецыялісты пакуль што шукаюць пацвярджэнне гэтай версіі. Па папярэдніх звестках, выбух адбыўся менавіта ў той частцы дома, дзе былі ўсталяваныя ацяпляльны кацёл і новая пліта.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

СНЕГ ПАДАЕ БАЛЮЧА

20 лютага ў Мсціслаўскую цэнтральную раённую бальніцу шпіталізаваная 13-гадовая дзяўчынка. Напярэдадні сямікласніца прыйшла на працу да бацькі, і пакуль размаўляла з ім, на яе з даху трохпавярховага будынка зваліўся снег. Снег быў мяккі і нібыта проста завалiў дзяўчынку, але на наступны дзень ёй спатрэбілася дапамога медыкаў. Цяпер яна лечыць траўму пазваночніка ў хірургічным аддзяленні, стан яе здавальняючы, і ў райбальніцы кажуць, што дзяўчынка папраўіцца.

Трагічнае здарэнне адбылося напярэдадні ў Магілёве 18 лютага. У жылым доме на вуліцы Першамайскай на 50-гадовага мужчыну зваліўся казырок з будаўнічым смеццем і снежнай наледдзю. Па дарозе ў бальніцу магілёвец памёр. Часовы драўляны шчыт быў усталяваны над уваходам у пад'езд як абарона ад тынкоўкі, якая падала, у час рамонту дома.

Алена КАЗЛОВА.

ДЫРЭКТАР МІНСКАГА ЖЭСА ЗВОЛЬНЕНЫ ЗА ТРАГІЧНУЮ ГІБЕЛЬ ЖАНЧЫНЫ АД ПАДЗЕННЯ ЛЕДЗЯША

Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення арганізацыйна-кадравай работы Мінгарвыканкама Валянцін Сітнік учора на аператыўнай нарадзе ў мэрыі, перадае БЕЛТА.

За невыкананне даручэння кіраўніцтва Мінгарвыканкама па ачыстцы дахаў жылых і адміністрацыйных будынкаў ад снегу, што прывяло да цяжкіх наступстваў, кіраўніку адміністрацыі Партызанскага раёна горада Леаніду Голубу аб'яўлена вымова. Яго намесніку вынесена папярэджанне аб няпоўнай службовай адпаведнасці.

Леаніду Голубу даручана вызваліць ад займаемых пасадаў дырэктара ЖЭСа № 46 і яго намесніка, які абавязаны быў наладзіць ачыстку дахаў дамоў ад снегу і наледзі. Вызваліць ад займаемых пасадаў работнікаў ЖРЭА Партызанскага раёна, адказных за ўтрыманне жылых дамоў. Кіраўніку Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, галоўнаму санітарнаму ўрачу горада Фёдару Германовічу даручана прыцягнуць да дысцыплінарнай адказнасці службовых асобаў цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Партызанскага раёна, адказных за арганізацыю кантролю па ўтрыманні жылых дамоў.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

А ДЗЕ ВАШ ФЛІКЕР?

Сёння ўвайшлі ў сілу змяненні ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

У адпаведнасці з новым заканадаўствам памер штрафу за адсутнасць у пешаходаў флікера ў цёмны час сутак павялічаны. Парушальнікам давядзецца раскашэліцца на суму ад адной да трох базавых.

Штраф у 105 тысяч рублёў (максімальны. — **Н.Д.**), згадзіцеся, не слабы ўдар па сямейным бюджэце. Менавіта таму ДАІ рэкамендуе неадкладна паклапаціцца аб сваёй бяспецы і аб таўшчыні свайго кашалька.

Надзея ДРЫЛА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.02.2010 г. (для б/н разлікаў)

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

▼1 долар ЗША	2 920,00
▲1 еўра	3 977,92
1 латвійскі лат	5 600,31
1 літоўскі літ	1 149,97
1 чэшская крона	154,44
1 польскі злоты	999,44
▼1 расійскі рубель	96,85
1 украінская грыўня	365,46

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,1510
10 UAH	37,6958
1000 BYR	10,3505
EUR	40,6285

ISSN 1990 - 763X

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НА ПАРТУГАЛІЮ АБРЫНУЛІСЯ ЛІЎНІ

Небывалыя для гісторыі партугальскага вострава ў Атлантычным акіяне Мадэйры дажджы абрынуліся ў мінулую суботу.

За 8 гадзін выпала месячная норма ападкаў. Больш за 40 чалавек загінулі і каля 120 атрымалі раненні ў выніку наймацнейшых за апошнія 17 гадоў паводкі і гразевых апоўзняў. Аэрапорт вострава зачыніўся. Некаторыя масты і дарогі размытыя, машыны знесла струменем вады, а дрэвы паваленыя і перагароджваюць шлях выратавальнікам. Вуліцы горада затопленыя, шматлікія жыхары Мадэйры засталіся без вады і электрычнасці. Узброеныя сілы Партугаліі накіравалі карабель з выратавальнікамі для аказання дапамогі пацярпелым.

ЯНУКОВІЧ НАЗВАЎ КАНДЫДАТАЎ

Абраны прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч разглядае кандыдатуры Сяргея Цігіпкі, Арсення Яцэнюка і Мікалая Азарава ў якасці прэтэндэнтаў на пасаду прэм'ер-міністра.

Мікалай Азараў — адзін з лідараў Партыі рэгіёнаў, Сяргей Цігіпка — бізнэсмен, фінішаваў трэцім на выбарах прэзідэнта Украіны, Арсень Яцэнюк — экспікер і былы кіраўнік МЗС Украіны — быў чацвёртым па выніках першага тура. Цырымонія інаўгурацыі новага прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча адбудзецца 25 лютага.

ПАМЁР АЎТАР «БЕЛАГА СОНЦА ПУСТЫНІ»

На 83-м годзе жыцця пайшоў з жыцця славуты рэжысёр Уладзімір Матыль.

У пачатку лютага вядомы кінарэжысёр быў шпіталяваны з падазрэннем на інсульт. Уладзімір Матыль быў дома адзін, з ім здарыўся прыступ. Па словах унука рэжысёра, кінематаграфіст сам не змог адкрыць брыгадзе «хуткай дапамогі», і дзверы давялося ўзламаць. Урачы выявілі ў рэжысёра пералом пазваночніка і пнеўманію. Яго стан ацэньваўся як цяжкі. Уладзімір Матыль — аўтар такіх шэдэўраў савецкага кіно, як «Зорка чароўнага шчасця», «Белае сонца пустыні», «Жэня, Жэнечка» і «Кацюша».

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні ў сувязі са смерцю народнага артыста Расіі Уладзіміра Матыля яго родным і блізкім.

«Уладзімір Якаўлевіч увайшоў у гісторыю кінамастацтва як вялікі рэжысёр і сцэнарыст, які валодаў яркім талентам і высокім прафесіяналізмам, — гаворыцца ў спачуванні. — Створаныя ім фільмы сталі класікай савецкага і сусветнага кінематографа, скарылі мільёны гледачоў сваёй захапляльнай сюжэтнай лініяй, душэўнасцю, глыбінёй і шчырасцю чалавечых пачуццяў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«МАЗЕРАЦІ» НА АХВЯРАВАННІ

Кіраўнік берлінскай дабрачыннай арганізацыі Treberhilfe Berlin, якая аказвае дапамогу беспрытульным, апынуўся ў цэнтры гучнага скандалу пасля таго, як высветлілася, што для службовых паездак ім быў набыты аўтамабіль Maserati Quattroporte, кошт якога перавышае 100 тысяч еўра.

Пра тое, што 47-гадовы Харальд Элерт, працай якога з'яўляецца дапамога абдзеленым, раз'язджае на аўтамабілі класа «люкс», стала вядома яшчэ ў 2009 годзе, калі «Мазераці» засеклі паліцэйскія радары за перавышэнне хуткасці: на ўчастку з дазволенай хуткасцю 70 кіламетраў у гадзіну машына рухалася пад 100. У арганізацыі Элерта працуюць 280 чалавек. Яе гадавы абарот у 2009-м склаў 15 мільёнаў еўра, а за тры апошнія гады ў розныя дабрачынныя праекты было інвеставана каля 10 мільёнаў. Акрамя «Мазераці» ў парк службовых машын Treberhilfe Berlin уваходзяць чатыры грузавікі і дзесяць легкавых машын, сярод якіх шмат «БМВ».

СТРАХА ЕДЗЕ І АБВАЛЬВАЕЦЦА

У 3 гадзіны ночы ў тарным цэху Мазырскага машынабудаўнічага завода абвалілася больш за 200 квадратных метраў даху. У будынку 1956 года пабудовы людзей не было і матэрыяльныя страты мінімальныя. Цэх прадпрыемства зачынілі, а работнікаў перавялі на іншыя ўчасткі.

Вышыня снежнага покрыва ў сярэднім па Гомельскай вобласці складае 44 см. Дахі старых дамоў, асабліва плоскія, не вытрымліваюць снежнай нагрузкі, якая стала павялічвацца з павышэннем тэмпературы, папярэджваюць у Гомельскім абласным упраўленні МНС. Усяго за выхадныя дні адбылося пяць выпадкаў іх абрушэння.

У вёсцы Вязавая Лельчыцкага раёна пры абрушэнні гаспадарчай пабудовы пацярпела 70-гадовая пенсіянерка. Яна знаходзілася разам з мужам у хляве, пабудаваным адразу пасля вайны, калі абрынулася страха. Жанчына атрымала складаныя траўмы, мужу пашанцавала больш, ён толькі вельмі напужаўся. Два выпадкі абрушэння дахаў зафіксаваныя ў вёсках Суткоў і Малінаўка Лоеўскага раёна. У Гомелі не вытрымаў выпрабавання снегам дах дома барачнага тыпу, 60-х гадоў забудовы, выведзены з эксплуатацыі. Жанчыне, якая затрымалася з пераездам у новы дом, моцна пашанцавала — шыферны дах, які ўпаў, не праламаў столевыя перакрыцці.

Акрамя таго, жыхары больш чым сотні населеных пунктаў Гомельшчыны ў выхадныя дні адчулі збоі ў электразабеспячэнні. Мокры снег, які наліпаў на правады, стаў прычынай аварый на лініях электраперадач. Энергазабеспячэнне парушалася ў Брагінскім, Жлобінскім, Рагачоўскім, Добрушскім, Гомельскім, Кармянскім, Рэчыцкім раёнах.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Прамая лінія

РАТАВАННЕ АЛКАГОЛІКА

Аб сучасных падыходах у лячэнні алкагольнай залежнасці можна распытаць **загадчыка сектара наркалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Уладзіміра Пятровіча МАКСІМЧУКА** падчас «прамой лініі», якая адбудзецца 24 лютага, у сераду, з 14.00 да 15.30 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО 3 МАРТА 2010 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня

1. О внесении изменений в решение Общего собрания акционеров ОАО «Белагропромбанк».
2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
3. О признании утратившими силу отдельных решений Общего собрания акционеров ОАО «Белагропромбанк».

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 22 февраля 2010 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 1 марта 2010 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 12 марта 2010 года.

Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 250 36 53.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

Время работы Контакт-Центра Банка:
8.00 - 20.00 - рабочие дни;
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ
Звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.

ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў дзеючага Прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанку з днём нараджэння.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ШТО ПЕРАВАЖЫЦЬ НА ШАЛЯХ?

Парламенцкая рабочая група па вывучэнні праблематыкі смяротнай кары прыступіла да працы

Пяцёра дэпутатаў і двое сенатараў ужо «зверылі гадзіннікі» і намецілі, што неабходна зрабіць. Сачыць за іх дзейнасцю асабліва цікава, калі ведаеш: яны ў сілах не проста гутарыць і выносіць некаму рэкамендацыі, але і прымаць рэальныя рашэнні. У парламента (як і ў кіраўніка дзяржавы) ёсць паўнамоцтвы на тое, каб адмяніць смяротную кару ці ўвесці мараторый на першым этапе. Як яны імі скарыстаюцца, пакажа час...

Уражаннямі ад першага абмеркавання і планамі падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» кіраўнік рабочай групы **Мікалай САМАСЕЙКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях.**

— Перш-наперш мы запытаем усе статыстычныя звесткі ў праваахоўнікаў — па прызначэнні і прымяненні смяротнай кары, а таксама пажыццёвага зняволення. Каб можна было ацаніць дынаміку, прааналізаваць, па якіх артыкулах найчасцей праходзяць такія злачынцы.

Не толькі кабінетнай палемікай плануюць заняцца парламентарыі. Яны асабіста азнаёмяцца з умовамі ўтрымання асобаў, якія адбываюць пажыццёвае зняволенне ў Жодзінскай папраўча-працоўнай установе.

— Там мы абавязкова сустрэнемся з грамадскасцю горада, хочам пачуць меркаванні мясцовых жыхароў з першых вуснаў.

Вопыт найбліжэйшых суседак — Расіі і Украіны — заканадаўцы таксама будуць вывучаць на месцы. Візіт некалькіх дэлегатаў ад рабочай групы запланаваны на красавік.

— Мы таксама запросім прадстаўнікоў Пракуратуры, Вярхоўнага Суда, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства юстыцыі. Мы разлічваем на своеасаблівы «круглы стол» — каб абмеркаваць, як справы са злачыннасцю ў Расіі пасля ўвядзення мараторыю на смяротную кару і ва Украіне пасля адмены. Як яны ўвогуле прыйшлі да такіх рашэнняў і як гэта паўплывала на крымінагенную сітуацыю ў дачыненні да асабліва цяжкіх злачынстваў — тых, за якія магло быць прызначанае смяротнае пакаранне. Гэта важна, каб зрабіць высновы для сябе.

Палітычны аргумент

— Беларусь павінна вывучыць усё навокал, перш чым прымаць тое ці іншае рашэнне па гэтым пытанні — і вопыт найбліжэйшых суседзяў, і Заходняй Еўропы, — перакананы палітык. Асабліва цікава, наколькі ўплывовым стане палітычны аргумент на карысць адмены смяротнай кары ці ўвядзення мараторыю. Улічваючы, што ён фактычна запальвае зялёнае святло на шляху да Бруселя. А гэта ў сваю чаргу адкрывае магчымасці не толькі для палітычнага дыялогу, але і для эканамічнага супрацоўніцтва.

— Поруч з іншымі аргументамі «за» гэты момант будзе ўлічвацца, але не будзе з'яўляцца асноўным, — кажа Мікалай Самасейка. — У Беларусі свой шлях. Ёй трэба ўзважана падыходзіць да гэтага пытання. Натуральна, павінны ўлічвацца і сусветныя тэндэнцыі, і вопыт найбліжэйшых суседзяў, і грамадская думка ў абавязковым парадку. Пераважная большасць краін Заходняй Еўропы прыняла рашэнне аб адмене смяротнай кары ці ўвядзенні мараторыю на першым этапе насуперак грамадскай думцы. Надалей яна, скажам так, «пацягнулася» за палітычным рашэннем, і цяпер тамтэйшае насельніцтва падтрымлівае такую пазіцыю. Беларусі ж якраз трэба прымаць рашэнне, узгадняючыся з грамадскай думкай.

З такім пасылам вывучэнне народнага меркавання трапіла ў ліст таго, што трэба зрабіць, адным з першых.

Vox populi

— Сутнасць у тым, што пасля рэферэндуму 1996 года (калі 80 працэнтаў беларусаў прагаласавалі за тое, каб пакаранне смерцю захавалася ў нашай краіне. — **Аўт.**) шмат чаго змянілася, — мяркуе Мікалай Самасейка. — Тады не было пажыццёвага зняволення, і максімальная мера пакарання складала 15 гадоў — натуральна, што большасці насельніцтва гэта падавалася яўна недастатковым. Цяпер сітуацыя іншая.

Не менш важна па сутнасці і якім чынам паставіць само пытанне:

— Калі беларускія інтэрнэт-парталы праводзяць апытанні сярод сваіх наведвальнікаў, апроч «за» і «супраць» яны прапануюць таксама альтэрнатывы — пажыццёвае заключэнне, а таксама мараторый. І галасы наведвальнікаў сыходзяць у гэтыя два дадаткі, таму каласальнай перавагі «за» смяротную кару не застаецца. Хоць, безумоўна, карыстальнікі інтэрнэту — гэта не ўся Беларусь. Пераважная частка электарату — якраз сельскае насельніцтва, дзе меркаванне можа адрознівацца. Таму мы прапануем адной з нашых сацыялагічных службаў, верагодна, Інстытуту сацыялогіі нацыянальнай Акадэміі навук, правесці даследаванне грамадскай думкі на гэты конт. Мы хочам валодаць матэрыяламі прафесійнага даследавання, якое адлюстроўвала б меркаванне ўсяго насельніцтва.

Са свайго боку заканадаўцы забяспечаць падрыхтоўку і правядзенне парламенцкіх слуханняў па пытанні аб смяротнай кары на вясновай ці восеньскай сесіі. Аднак гэта ні ў якім разе не мэта ўсіх намаганняў парламентарыяў, а толькі сродак яе дасягнення. Саму ж мэту ўдзельнікі рабочай групы бачаць у як мага больш маштабнай дыскусіі:

— Давядзенне да вырокай грамадскасці сітуацыі са смяротнай карай у Беларусі. Прычым без крэну ў той ці іншы бок. Загадзя нельга планаваць, якім будзе вынік.

Нельга было не пацікавіцца танальнасцю палілогу ў самой рабочай групе, ці ва ўсім яе ўдзельнікі салідарныя?

— Спрэчак пакуль няма, — адзначае М. Самасейка. — Ды і ўзнікаць яны могуць тады, калі палова групы «за», а палова — «супраць». Але ж мы гаворым пра тое, што павінна быць шырокая дыскусія на падставе аб'ектыўнай інфармацыі, менавіта на гэта мы ўсе нацэленыя. Ну а калі аб'ектыўная інфармацыя, якія могуць быць спрэчкі?

Статуэтка Фемідыа на працоўным стале нашага суразмоўцы — у недалёкім мінулым, дарэчы, суддзі — падштурхоўвае нас на яшчэ адно пытанне: што ж пераважае на шалях для яго самога?

— Дастаткова важкіх аргументаў супраць адмены смяротнай кары ўсё ж такі няма. А сумненні тлумачацца на карысць абвінавачанага... — па-судзейску адказвае палітык.

На яго думку, мараторый зручны тым, што з'яўляецца часовай мерай:

— Мы ад гэтага нічога не губляем. Калі будзе ўведзены мараторый на выкананне, людзі, якім прызначаная смяротная кара, нікуды не дзенуцца. А калі раптам, крый Божа, сітуацыя пахіснецца ў іншы бок, то мараторый можна і адмяніць. Для таго ж, каб адмяніць смяротную кару, трэба ратыфікаваць Шосты пратакол Канвенцыі па правах чалавека. І адна рэч ратыфікацыя пратакола, а зусім іншая — яго дэнансацыя... Такіх прэцэдэнтаў у мірны час і не было нават. Увогуле ж нашай Канстытуцыяй і Крымінальным кодэксам (які быў прыведзены ў адпаведнасць з ёю пасля заключэння Канстытуцыйнага суда ў 2004 годзе) прадугледжваецца часовы характар смяротнай кары, аж да яе адмены. Так што фактычна мы кажам аб адмене смяротнай кары, таму мараторый тут — нават не залатая сярэдзіна, а першы этап.

На шалях мноства аргументаў: і маральны (магчымасць судовых памылак), і эканамічны (фінансавыя выдаткі на ўтрыманне пажыццёва зняволеных), і палітычны (Беларусь — апошняя еўрапейская краіна, дзе караюць смерцю, і гэта — перашкода ў міжнародных адносінах), і судова-прававы (адсутнасць выключнай меры можа паўплываць на крымінагенную сітуацыю), ды ці мала іх... Важна, які пераважыць...

Ала МАЧАЛАВА.

«РАШЭННЕ ВЕЗЦІ Ў МІНСК» «RAMMSTEIN» — ГЭТА ПАМЫЛКА?

На слыху

Першы ў Беларусі канцэрт легендарнага нямецкага гурта, запланаваны ў комплексе «Мінск-Арэна» на 7 сакавіка (дарэчы, на гэты момант у продажы засталіся толькі білеты ад 250 тысяч беларускіх рублёў і вышэй), нечакана трапіў пад пагрозу зрыву. Павышаную ўвагу да яго праявіла Грамадская рада па маральнасці, удзельнікі якой мяркуюць, што трэба папярэдне ўзгадніць праграму, каб у ёй не было «прапаганды гвалту, жорсткасці і амаральнасці».

У адмысловай заяве, якая паступіла днямі ў інфармацыйнае агенцтва «Інтэрфакс-захад», у прыватнасці адзначаецца: «Рашэнне везці ў Мінск «Rammstein — гэта памылка, якая можа нам дорага абысціся. Па перакананні членаў рады, творчасць гурта з'яўляецца непрыкрытай прапагандай гомасэксуалізму, мазахізму і іншых вычварэнстваў, жорсткасці, гвалту і непрыстойнай лаянкі». Кіраўнік Грамадскай рады па маральнасці, пісьменнік Мікалай Чаргінец, лічыць, што каб пазбегнуць усяго гэтага, яшчэ да канцэрта неабходна зладзіць перадпрагляд праграмы, якую знакаміты нямецкі калектыў хоча паказаць беларускай публіцы. З гэтай прапановай члены рады звярнуліся ў Міністэрства культуры Беларусі.

Высветліць, што «свеціць» беларусам з канцэртам, мы паспрабавалі ў яго арганізатараў. У Палацы Рэспублікі званкам журналістаў ужо не здзіўляюцца, аднак падкрэсліваюць, што «ў нас усё ідзе па плане», ніякіх афіцыйных прэтэнзій тут не атрымлівалі, таму пакуль што нічога не адмяняецца. Прэс-сакратар Палаца Рэспублікі Тамара Шахназарава сцвярджае, што каментаваць яшчэ няма чаго — рабочыя моманты паціху ўзгадняюцца, падрыхтоўка да канцэрта ідзе па плане, і яе не зрываюць ніякія інтэрнэт-чуткі.



Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Ванкувера

СЛАВА НЕ ПРЫХОДЗІЦЬ АДНА

XXI зімовыя Алімпійскія гульні ў канадскім Ванкуверы для Беларусі паспелі стаць гістарычнымі. У першую чаргу з пазіцыі заваёвы нашымі айчыннымі алімпійцамі адразу дзвюх алімпійскіх узнагарод у біятлоне. Цяпер што ні дысцыпліна — погляды на п'едэстал.

У тым ліку і ў масавым старце сярод мужчын і жанчын на 15 і 12,5 км адпаведна. Пасля таго, як выхаванец магалёўскай біятлоннай школы Сяргей Новікаў заваяваў серабро на пару з легендай сусветнага біятлона нарвежцам Оле-Эйнерам Б'ёрндаленам, прэтэнзіі беларуса на пастаянную «прапіску» ў эліце тлумачацца проста.

Вось і на масавым старце сярод мужчын ён быў адзіным прадстаўніком Беларусі сярод 30 выбраных атлетаў свету. Праўда, пацвердзіць заяўку на медаль у гэтай дысцыпліне магіляўчаніну не суджана было — 3 недакладныя выстралы на стойцы і выніковае 20-е месца.

Праблемная сітуацыя ўзнікла з выхадам Дашы Домрачавай на масстарт. Яшчэ да пачатку гонкі галоўны трэнер жаночай каманды Андрыян Цыбульскі расказаў беларускім журналістам, што Даша напярэдадні дрэнна сябе адчувала. Высокай тэмпературы не было, аднак стан быў не самым лепшым. Сумеснае рашэнне было — стартаваць. У такім выпадку перад гэтай смелай дзяўчынай можна зняць капялюш. Перамагаючы дыскамфорт, Даша змагла з першага этапу ўліцца ў лік лідараў і заставалася на «мушцы» фотаапаратаў і тэлекамер да самага фінішу. Адзін штрафны круг і ганаровае 6-е месца. Малайчына! Людміла Калінчык і Надзея Скардзіна занялі адпаведна 17-е і 22-е месца.

Зборная Германіі была пастаўлена беларусамі на калені

Адразу пасля заканчэння гонак з масавага спорту нашы героі-медалісты былі ўзяты ў абарот прадстаўнікамі беларускага штаба і журналістамі. З вуснаў міністра спорту і турызму Алега Качана, памочніка Прэзідэнта краіны па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцці турызму Ігара Заічкова, першага віцэ-прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта Генадзя Аляксеенкі, шэфа місіі, намесніка міністра спорту і турызму Дзмітрыя Шычко і іншых чыноўнікаў і адказных асобаў гучалі цёплыя словы і пажаданні ў адрас медалістаў заваяваць новыя ўзнагароды. Зрэшты, такая верагоднасць яшчэ захоўваецца, паколькі ў біятлоннай праграме Алімпіяды застаюцца дзве эстафетныя гонкі. Вянцом усіх выступленняў стане мужчынская эстафета 4х7,5 км 26 лютага. А вось жанчыны закрыюць сваю праграму (4х5 км) раней — 23 лютага. Зразумела, што гэты дзень звязаны са святам мужчын. Ці змогуць біятланісткі зрабіць прыемны сюрпрыз сваім калегам-мужчынам?!

А вось беларускім хакеістам, як сапраўдным мужчынам, прыдзецца разлічваць у гэты дзень на свае сілы. Іх чакае матч плэй-оф супраць вечнага суперніка — каманды Швейцарыі.

Пасля трыумфальнага выступлення ў апошнім кваліфікацыйным матчы супраць немцаў, які падначаленыя Міхаіла Захарава выйгралі 5:3, каціроўкі беларускай зборнай сярод шматлікіх балельшчыкаў і спецыялістаў у Ванкуверы значна падраслі. Зрэшты, вынік гэтага матча шакіраваў і расійскіх калег-журналістаў. Да ўжо вядомых Кірыла Набутава, Дзмітрыя Губерніева далучыўся вядомы футбольны тэлекаментатар Віктар Гусеў. Кампліменты ліліся ракой. А што ў расійскай камандзе пасля пройгрышу ў серыі булітаў камандзе Славакіі? Паводле слоў таго ж Кірыла Набутава, нейкіх разборак палётаў не праводзілася, бо Славакія — не тая каманда, якую можна закідаць шапкамі. На сходзе хакеістаў слова ўзяў сам Аляксандр Авечкін, форвард «Вашынгтон Кэпіталз». На яго думку, нічога страшнага не адбылося. Наадварот, добра, што гэтае крыўднае паражэнне напаткала расійскую каманду на папярэднім этапе. Расіяне ўзялі абавязацельствы заняць першае месца ў групе. І зрабіць гэта ім удалося. Матч з камандай Чэхіі падначаленыя Вячаслава Быкава выйгралі з лікам 4:2. Аляксандр Авечкін хоць і не забіваў, але ж мае самае цеснае дачыненне да перамогі. Праведзены ім сілавы прыём супраць Яраміра Ягра канадскае тэлебачанне круціць няспынна, як і галы Яўгена Малкіна, Паўла Дацюка і Вячаслава Казлова, забітыя ў вароты чэхаў.

Не перастае быць актуальнай у канадскіх тэлевізійніках'ў і гульня беларускай каманды. І праз тры дні перамога Міхала Захарава і К° ва ўсіх каментатараў на вуснах. Як і абяцанне настаўніка беларусаў прыкласці максімум намаганняў, каб выйграць у швейцарцаў. А гэта — шлях у васьмёрку мацнейшых. Чакаць засталося нядоўга.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.
Канада, Ванкувер.

НЕАФІЦЫЙНЫ МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК

	Краіна	Золата	Серабро	Бронза	Усяго
1.	ЗША	7	7	10	24
2.	Германія	6	7	5	18
3.	Нарвегія	5	3	4	12
4.	Швейцарыя	5	0	2	7
5.	Канада	4	4	1	9
6.	Паўднёвая Карэя	4	4	1	9
7.	Швецыя	3	1	2	6
8.	Кітай	3	1	1	5
9.	Нідэрланды	3	1	1	5
10.	Аўстрыя	2	3	3	8
—	Расія	2	3	3	8
12.	Францыя	2	2	4	8
13.	Славакія	1	1	1	3
14.	Аўстралія	1	1	0	2
15.	Чэхія	1	0	3	3
16.	Вялікабрытанія	1	0	0	1
17.	Польшча	0	3	1	4
18.	Латвія	0	2	0	2
19.	Італія	0	1	3	4
20.	Японія	0	1	2	3
21.	**БЕЛАРУСЬ**	**0**	**1**	**1**	**2**
—	Славенія	0	1	1	2
—	Харватыя	0	1	1	2
24.	Казахстан	0	1	0	1
—	Фінляндыя	0	1	0	1
—	Эстонія	0	1	0	1

ВЫНІКІ ДЗЯВЯТАГА І ДЗЯСЯТАГА ДЗЁН СПАБОРНІЦТВАЎ

Фрыстайл

Прайшла жаночая кваліфікацыя ў акрабатыцы. Беларуска Ала Цупер, паказаўшы вынік 195,76 бала, заняла першае месца. Сёмае месца заняла яшчэ адна беларуска Асоль Слівец, якая атрымала 169, 39 бала. У выніку ў фінале 24 лютага выступяць дзве нашы суайчыннiцы.

Лыжныя гонкі

Трэці залаты алімпійскі медаль з'явіўся ў скарбонцы зборнай Швецыі. Яго ў лыжных гонках у мужчынскім дуатлоне заваяваў Маркус Хелнер. У немца Тобіяса Ангера «серабро», яшчэ адзін швед Ёхан Олсан удастоены бронзавага медаля. Зноў не пашчасціла расіянам: Аляксандр Лягкоў фінішаваў чацвёртым, не дацягнуўшы да трэцяга месца ўсяго 4 секунды. Наш Аляксей Іваноў заняў 4-е месца, а Сяргей Далідовіч не фінішаваў.

Біятлон

21 лютага біятланісты разыгрывалі ўзнагароды ў масстарце. Залаты медаль зборнай Расіі прынёс Яўген Усюгаў. «Серабро» атрымаў француз Марцін Фуркад, а «бронза» дасталася славаку Паўлу Хурайту. Адзіным беларусам, які браў удзел у гонцы, быў Сяргей Новікаў, ён заняў 20-е месца. У жанчын перамогу атрымала немка Магдалена Нойнер, «серабро» ў расіянкі Вольгі Зайцавай, «бронза» — у немкі Сімоны Хаусвальд. Беларуска Дар'я Домрачава з адным промахам размясцілася на шостым месцы.

Гарналыжны спорт

Сенсацыйна завяршыліся спаборніцтвы ў супергіганце. На верхнюю прыступку п'едэстала ўзнялася аўстрыйка Андрэа Фішбахер, якая амаль на паўсекунды апярэдзіла славенку Ціну Мазэ. Галоўная фаварытка турніру Ліндсэй Вон, якая залішне асцярожнічала на спуску, задаволілася толькі бронзай.

Амерыканскі гарналыжнік Бодэ Мілер выйграў спаборніцтвы ў суперкамбінацыі. «Серабро» дасталася харвату Івіцы Касцелічу, «бронза» — швейцарцу Сільвану Цурбрыгену. Адзначым, што гэта пятая алімпійская ўзнагарода Бодэ Мілера, але «золата» ён атрымаў упершыню. Раней ён станавіўся ўладальнікам трох сярэбраных і аднаго бронзавага медаля.

Скачкі на лыжах з трамплiна

Адметнага алімпійскага поспеху дасягнуў швейцарац Сімон Аман. У скачках са 120 метровага трамплiна ён у чацвёрты раз стаў алімпійскім чэмпіёнам. Паляк Адам Малаш заваяваў «серабро», аўстрыец Грэгар Шлірэнцаўэр — «бронзу».

Канькабежны спорт

Канькабежцы разыгралі ўзнагароды на дыстанцыі 1500 м. Узнагарода найвышэйшай пробы дасталася галандцу Марку Тайтэрту. Галоўны прэтэндэнт на «золата» амерыканец Шані Дэвіс застаўся другім, «бронза» ў нарвежца Хаварда Бока. Раісянін Іван Скобраў, які выйграў першы для расійскай зборнай медаль у Ванкуверы — бронзу на дыстанцыі 5000 м, аказаўся чацвёртым. У жанчын алімпійскай чэмпіёнкай стала галандка Ірэн Вюст. Другі вынік у канадкі Крысціны Гроус. На трэцім месцы чэшка Марціна Саблікава.

Меркаванне

НАВОШТА ЛЮДЗЯМ БУДАВАЦЬ МЕЖЫ ПАМІЖ САБОЙ?

Старшыня Саюза палякаў у Беларусі Станіслаў Сямашка ставіць мэту зрабіць гэту грамадскую арганізацыю прыкладам для іншых

— На справаздачна-выбарчым з'ездзе СПБ у верасні 2009 года і ў нядаўніх зваротах да польскіх уладаў вы выказаліся за тое, каб пакінуць у мінулым усе непаразуменні, канфлікты і пачаць новы этап супрацоўніцтва, як кажуць, з чыстага ліста. Была пацверджана і прынцыповая пазіцыя не ўмешвацца ў палітыку, працуючы строга ў рамках статутных задач грамадскай арганізацыі. Аднак апошнія падзеі сведчаць, што гэта пазіцыя падабаецца не ўсім...

Фота Яраслава ВАНЮКОВІЧА.

— «Чысты ліст» азначае, што, згодна са статутам СПБ, трэба распачаць канкрэтную працу па адраджэнні і развіцці польскай культуры, мовы. Што не толькі важна для беларускіх грамадзян польскай нацыянальнасці, але і павінна аб'ядноўваць суседняя дзяржавы. І групка людзей, якая пазіцыяную сябе нейкім саюзам, убачыла, што мы сапраўды пачалі зладжана працаваць. Нармальна, талкова, у спакойным рэжыме. Актывізуюцца члены саюза, з'яўляюцца цікавыя задумкі, у тым ліку па выхадзе на самафінансаванне. Яны зразумелі, што гэты Сямашка і сапраўды можа нешта зрабіць, і таксама актывізаваліся. Але ў якім кірунку?

У Івянцы групка па сутнасці прыватызавала тое, што належыць легальнаму саюзу, і пачала незаконным метадам там «мудрыць». Выязджаем, бяром статут: дзе статутная дзейнасць? Парушэнне закона. Галоўны савет СПБ выключае Тэрэсу Собаль з членаў саюза, праводзім выбары новага старшыні аддзялення нашага грамадскага аб'яднання. Поўная зала, людзі — «за». Усё, здавалася б, талкова, дэмакратычна. Не, нехта ж зацікаўлены ў тым, каб зноў узбударажыць сітуацыю, зноў чарніць нашу краіну. Не задавальняе, пэўна, каб дзейнасць СПБ служыла добрасуседству, збліжала народы, кіраўніцтва краін. Замест гэтага працягваецца пошук «ворагаў», дзяльба палякаў на «правільных» і «няправільных», лепшых і горшых.

— Вы таксама можаце трапіць у «чорны спіс» грамадзян Беларусі, якім не будуць выдавацца візы на ўезд у Польшчу? Гэта не будзе ўдарам па вашых асабістых інтарэсах, не пашкодзіць бізнэсу?

— Я заўсёды марыў і спадзяваўся, што ў XXI стагоддзі, да гэтага часу развіцця грамадства ўвогуле не будзе межаў паміж краінамі. А тут людзі будуюць межы... паміж сабой, складаюць нейкія спісы неўязных... Гэта абсурдны, абсалютна незаконны, больш за тое, лічу, злачынны крок. Страшна нават уявіць, што чакае свет, калі падобная практыка атрымае распаўсюджанне і ў іншых краінах.

Што датычыцца ўключэння ў «чорны спіс» мяне асабіста, то з маім стажам прадпрымальніка я яшчэ пагляджу (калі ў іх хопіць розуму гэта зрабіць), на які час гэтага розуму хопіць ім. Тым самым яны, перш за ўсё, пакажуць сваю непісьменнасць у падыходзе да кантактаў з нашай краінай. Не бачыць, што напярадзе? Распальваць канфрантацыю? Гэта зусім не той шлях для любой краіны.

Зрэшты, хвалююся не асабіста за сябе. Вось перад вамі заходзілі людзі, у якіх памерла цётка, але яны не могуць выехаць у Польшчу, бо трапілі ў спіс «няправільных». І такіх зваротаў, што забаронены ўезд у суседнюю краіну і нельга сустрэцца са сваякамі, наведаць могілкі, шмат. За што такая кара? Навошта рабіць гэтых людзей ворагамі польскай дзяржавы? Пэўна, камусьці выгадна распальваць гэтыя жарсці, адпрацоўваць грошы...

— Аптымізму не страчваеце?

— Мне здаецца, што розум пераможа і паступова ўсё ўвойдзе ў нармальнае рэчышча. Пра гэта сведчыць і нядаўняе міжурадавае беларуска-польскае пагадненне аб малым памежным руху, якое заключылі міністры замежных спраў.

Калі ж казаць аб найбліжэйшых перспектывах нашага саюза, то неабходна, як кажуць, працаваць закасаўшы рукавы. Каб СПБ стаў прыкладам і для іншых грамадскіх арганізацый. І самому яшчэ шмат чаму трэба павучыцца, і іншых навучыць. Таму штодзённа ідзе карпатлівая праца, у кожнага члена праўлення — свой канкрэтны «ўчастак». Ды і не толькі ў іх. Падчас паездак па рэгіёнах я пераканаўся, што дзе актыўны кіраўнік аддзялення СПБ, дзе наладжана цеснае супрацоўніцтва з мясцовымі ўладамі — там і грошы на рамонт тых жа польскіх дамоў знаходзяцца, і шмат культурных імпрэзаў, і мова польская вывучаецца. Такім чынам, кожнаму, гаворачы аб працы саюза на новым узроўні, трэба перш за ўсё пачынаць з сябе.

Што, зразумела, цалкам адносіцца і да мяне, як кіраўніка СПБ. Чатыры гады праляцяць імгненна і для мяне галоўнае, каб на наступным з'ездзе людзі не казалі, што, маўляў, прыйшоў Сямашка, пыл у вочы пусціў і не больш за тое. Ёсць шчырае жаданне пакінуць талковы след, зрабіць нешта карыснае. У прыватнасці, стаўлю задачу, каб ужо да гадавіны пасля сёмага з'езда ў СПБ не было даўгоў.

— Што для гэтага робіцца?

— Не буду хаваць, што тая «разбэшчанасць», калі было фінансаванне саюза з Польшчы, не пакідае некаторых па сёння. Я ад гэтага моманту адыходжу і, маючы пэўны досвед у бізнэсе, хачу задзейнічаць яго ў інтарэсах СПБ. Каб не толькі разлічваць на падтрымку дзяржавы, але і самім зарабіць грошы і зрабіць нешта прыемнае не толькі для палякаў, але і для ўсіх жыхароў Беларусі. Пры гэтым, падкрэслю, я не шукаю нейкай асабістай выгады. Неўзабаве распачне сваю дзейнасць прадпрыемства (вытворчасць, гандаль), дзе заснавальнікам на сто працэнтаў выступае СПБ.

Планаў шмат. У прыватнасці, калі аднаго класа па вывучэнні польскай мовы (не толькі для дзяцей, але і для дарослых) пры сядзібе СПБ у Гродне мала — будзем яшчэ арганізоўваць.

— А ці ёсць шанцы знайсці нейкі кампраміс, нешта агульнае з групай людзей, якая таксама лічыць сябе Саюзам палякаў?

— Мая пазіцыя — размаўляць з тымі, у каго ёсць такое жаданне весці дыялог. Не ў «цемры», дзе гэта заўсёды лягчэй, ды і ў спіну могуць ударыць, а адкрыта, у дыскусіі. Нават на тэлебачанні, перад аўдыторыяй усёй нашай краіны. Ды і ў Польшчы, у свеце няхай паслухаюць і разбяруцца, дзе праўда, а дзе хлусня.

— Ці не адцягвае ўвагу цяперашняя сітуацыя вакол СПБ ад падрыхтоўкі да чарговага фестывалю нацыянальных культур, які сёлета адбудзецца ў Гродне?

— Рыхтуемся вельмі старанна, адказна, зацверджаны графік адборачных тураў. Не сумняваюся, што будзем дастойнымі прадстаўнікамі на гэтым свяце.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Польскія арганізацыі ў Беларусі ўцягнуты не ў свае справы

Польскія арганізацыі ў Беларусі вельмі моцна ўцягнуты зусім не ў тыя справы, якімі павінны займацца аб'яднанні нацыянальных меншасцяў. Аб гэтым заявіў польскі сенатар Уладзімеж Цімашэвіч у інтэрв'ю польскаму штодзённіку «Кур'ер паранны».

Польскі ўрад з гэтай сітуацыяй спраўляецца не самым лепшым чынам, лічыць сенатар. Метады ўплыву польскага ўрада на тое, што адбываецца ў Беларусі, вельмі абмежаваны. «Знешняя палітыка Польшчы трактуецца польскімі палітычнымі партыямі як інструмент у іх унутраных гульнях і негатыўна ўплывае на рэзультатыўнасць. Націск СМІ і апазіцыі на ўрад прывёў да таго, што публічна пастаўлены своеасаблівы ўльтыматум беларускім уладам. Так наогул не робяць», — сказаў Уладзімеж Цімашэвіч.

Вядома, дапускае ён, бываюць сітуацыі, калі варта прымяняць цвёрдыя аргументы, аднак трэба пазбягаць публічнага ўніжэння другога боку. «У адваротным выпадку трэба чакаць негатыўнага адказу. Я баюся, што лёс польскіх арганізацый у Беларусі вельмі моцна ўцягнуты зусім не ў тыя справы, якімі павінны займацца аб'яднанні нацыянальных меншасцяў», — адзначыў сенатар. Арганізацыя палітычнага наступу з мэтай абароны выключных правоў нацменшасцяў без адначасовага згадвання аб недапушчальнасці рэпрэсій у адносінах да любой праявы незалежнасці было б памылкай, якая можа прывесці і да нацыянальнай варожасці ў Беларусі. Палякі толькі страцілі б ад гэтага, рэзюмуе палітык.

Уладзімеж Цімашэвіч — польскі дзяржаўны і палітычны дзеяч. У 1996—1997 гадах быў прэм'ер-міністрам Польшчы. Таксама быў міністрам замежных спраў ва ўрадзе Лешака Мілера (2001—2004), а затым ва ўрадзе Марака Белкі (2004—2005). Маршалак (старшыня) Сейма Польшчы (2005 год) і адзін з кандыдатаў на пасаду прэзідэнта ў 1990 годзе (9,21 працэнта) і ў 2005-м (адмовіўся). Пасля 2005 года не прымаў удзелу ў палітыцы. У кастрычніку 2007 года быў, аднак, выбраны ў Сенат як адзіны беспартыйны кандыдат.

БЕЛТА.

Абзац

Пачатак веснавой паводкі ў Беларусі прагназуецца на другую дэкаду сакавіка. Па звестках МНС, найбольш верагоднае падтапленне сельгасугоддзяў, населеных пунктаў, размешчаных уздоўж рэчышча Прыпяці (Пінскі, Столінскі, Лунінецкі, Петрыкаўскі, Жыткавіцкі, Лельчыцкі раёны), Дняпра (у Рэчыцкім і Лоеўскім раёнах), Сажа (у Слаўгарадскім раёне).

Два школьнікі пацярпелі ў Мінску ад снегу, што зваліўся з даху. Абодва выпадкі адбыліся 20 лютага. Першы — на вул. Чкалава, дзе на вучня 6-га класа з даху зваліліся наледзь і мокры снег. Пасля аказання меддапамогі з дыягназам «удар левай кісці рукі» дзіця было адпушчана дадому. Другі выпадак адбыўся на вул. Раманаўская Слабада. З жылога дома на хлопчыка 2000 года нараджэння, вучня 3-га класа, звалiўся мокры снег. Пасля аказання меддапамогі ён таксама быў адпушчаны дадому з дыягназам «пашкоджанне мяккіх тканак галавы».

Электрацягнік з пасажырамі прастаяў паміж станцыямі мінскага метро 20 хвілін. НЗ адбылося 20 лютага ў 10 гадзін вечара. Састаў рухаўся па Аўтазаводскай лініі ў кірунку станцыі «Магілёўская» і спыніўся паміж станцыямі «Спартыўная» і «Пушкінская». Цягнік некалькі разоў кранаўся з месца, аднак кожны раз рух спыняўся. Па тлумачэнні спецыялістаў, затрымка была выкліканая тэхнічнымі прычынамі.

Генеральная пракуратура Беларусі падазрае галоўнага бухгалтара РУП «Белпрамбудпраект» Міністэрства будаўніцтва ў буйных крадзяжах, паведамляе БЕЛТА. Бухгалтар падазраецца ў тым, што на працягу мінулага года складала заведама падложныя дакументы бухуліку, а таксама ўносіла змяненні ў службовую камп'ютарную праграму. З дапамогай гэтай махінацыі было скрадзена больш за Br56 млн, што належалі прадпрыемству.

Пракуратура Маскоўскага раёна Мінска праводзіць праверку па факце смерці слесара сталічнага аўтапарка. Мужчына быў знойдзены мёртвым ноччу 21 лютага ў салоне аўтобуса МАЗ на тэрыторыі прадпрыемства. Ён ляжаў на падлозе, падклаўшы пад галаву куртку. Прычыны смерці вызначаюцца.

Каля 30 рукадзельніц з Лодзінскага ваяводства (Польшча) уручную вышываюць карціну «Грунвальдская бітва». Работа майстрых, прысвечаная 600-годдзю бітвы пад Грунвальдам, з'яўляецца копіяй твора вядомага польскага мастака Яна Мацейкі. Памер карціны — 4 на 10 м.

Поўны абзац

Супрацоўнікі Крычаўскага РАУС раскрылі крадзеж воданапорнай вежы коштам Br24 млн. Каля вёскі Слабада гэтага раёна чацвёра зламыснікаў, выкарыстоўваючы газазварку, зрэзалі воданапорную вежу, што абслугоўвала мясцовую ферму, распілавалі яе на часткі, а затым вывезлі і схавалі непадалёк ад месца злачынства. Зламыснікі меркавалі збыць вежу ў якасці металалому за межы краіны. Заведзена крымінальная справа.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

БУХГАЛТАР ЗАТРЫМАЛА ЗЛАЧЫНЦУ

У Віцебску на прыпынку грамадскага транспарту на цэнтральнай вуліцы Леніна бухгалтар фірмы затрымала на месцы злачынства спецыялістку па крадзяжах, якая ў тралейбусе скрала кашалёк з яе сумачкі. У дачыненні да 49-гадовай беспрацоўнай, раней судзімай, заведзена крымінальная справа. У кашальку было ўсяго толькі 84 тысячы рублёў. А пасядзець у няволі давядзецца некалькі гадоў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Акцыя «Не піву і слабаалкагольным напіткам у грамадскіх месцах»

Андрэй ЗАХАРЭЎСКІ.

Акцыя, ініцыятарам якой выступіла Міністэрства аховы здароўя, пройдзе пад дэвізам «Разам абаронім здароўе дзяцей і моладзі ад піва і слабаалкагольных напіткаў». Яна арганізавана ў мэтах рэалізацыі палажэнняў Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі на 2007-2010 гады. У ходзе акцыі прадугледжана актыўнае інфармаванне насельніцтва аб недапушчальнасці ўжывання піва і слабаалкагольных напіткаў дзецьмі і моладдзю, аб негатыўных наступствах для здароўя размернага

ВЁСКА МОЖА СТАЦЬ ВЯСЕЛЬНАЙ

Па ініцыятыве **старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра КОСІНЦА** вакол Віцебска ствараецца «залатое кальцо» для арганізацыі турызму і адпачынку. Вёска Доўжа, што за 20 кіламетраў ад абласнога цэнтра, з насельніцтвам больш за 600 чалавек, мяняецца літаральна на вачах.

Побач з Доўжай — вялікае і прыгожае возера. Пры гэтым пляж, мякка кажучы, быў не прыстасаваны для масавага адпачынку. Падчас купальнага сезона сюды прыязджаюць многія гараджане. Купаюцца, гуляюць у футбол. На возеры, бясплатна, патрэбны пракат лодак, катамаранаў. А дзе перакусіць? Дзе, калі спатрэбіцца, пераначаваць? Усе гэтыя праблемныя пытанні вырашаюцца. Тым больш што Доўжа на транзітным кірунку ля дарогі ў бок Расіі. Штодня шмат машын накіроўваюцца ў бок краіны-суседкі і наадварот.

Калі аўтар гэтых радкоў наведаў Доўжу, здзівіла і тое, што пасёлак увечары быў у цемры. Гэта пакуль што. І святло правядуць, і «ляжачага паліцэйскага» пакладуць, ды і хуткасць для аўто па вёсцы абмяжуюць. Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец паставіў мясцовым уладам канкрэтную задачу — ужо да лета гэтага года выправіць сітуацыю.

— Берагі возера неабходна пачысціць, закупіць лодкі, — падзяліўся планамі губернатар. — Добры пункт харчавання ля дарогі трэба адкрыць, арганізаваць стаянку аўтамабіляў. І лазня патрэбна. Неабходна кардынальна пашыраць асартымент тавараў у прыдарожнай краме. Вось захочуць праязджыя купіць сувеніры на памяць, адзенне з лёну, напрыклад. І, як кажуць, дзе возьмеш?

Амаль што ўсе азёры вобласці павінны нам прыносіць прыбытак. Прыдарожны сэрвіс будзе добрай крыніцай папаўнення мясцовага бюджэту...

Паводле слоў **старшыні Віцебскага райвыканкама Івана ВАЗЬМІЦЕЛЯ**, трэба выкарыстоўваць вельмі выгаднае месцазнаходжанне вёскі. Наогул вакол Віцебска на тэрыторыі раёна можна стварыць «залатое кальцо» — спецыяльны турыстычны праект з развіццём прыдарожнага сэрвісу.

Губернатар даручыў таксама ўключыць Доўжу ў рэгіянальную праграму «Азёры», якая ствараецца. Турысты змогуць наведаць адразу некалькі азёраў. Ёсць ідэя стварыць у вёсцы Доўжа і верталётную пляцоўку. Пад Віцебскам знаходзіцца база верталётаў. Платныя катанні на верталёце вельмі папулярныя сярод гараджан. Замежнікам такая прапанова — прыляцець з радзімы Шагала ў сучасную курортную зону ў беларускай вёсцы, спыніцца на дзень-два, безумоўна, спадабаецца.

Тутэйшыя расказалі мне, што да самага вялікага ў раёне валуна, які называюць «Камень кахання», спецыяльна прыязджаюць шлюбныя картэжы з Віцебска. Чаму ён так называецца — ёсць цэлая легенда. Ужо сёлета вёска можа атрымаць і статут «вясельнай». Чаму б і не?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЛЫЖНІК, БЯЖЫ!

У «Магілёўскай лыжні-2010» узялі ўдзел больш за 500 чалавек

Суботняй раніцай ледзяны дождж ператварыўся ў колкі снег, але гэта не паўплывала на настрой удзельнікаў зімовага спартыўнага свята. На лыжнай базе ў Пячэрскім лесапарку ў Магілёве лясная паляна стракацела ад рознакаляровых сцягоў райцэнтраў. Лыжныя каманды, якія прыехалі з усіх сельскіх раёнаў, на пастраенні ўзначалілі старшыні райвыканкамаў.

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Кіраўнік Магілёўскай вобласці Пётр РУДНІК заахвочваў да спартыўнага ладу жыцця асабістым прыкладам.

Сваім прыкладам заахвочваў да спартыўнага ладу жыцця **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК**. «Чыноўнікі павінны зняць гальштукі і ехаць на лыжах разам з жыхарамі вобласці», — такая яго ўстаноўка.

Пётр Руднік павіншаваў усіх удзельнікаў лыжні са святам і стартаваў сам.

— Удзел у такіх спаборніцтвах дае зарад бадзёрасці на наступны тыдзень, добры настрой, — сказаў журналістам пасля дыстанцыі кіраўнік вобласці. — Спорт — гэта здарова і здарова! Гэта крыніца аптымізму, добрага самаадчування і працаздольнасці.

Лыжнікі стартавалі пад крыкі балельшчыкаў, фінішавалі пад аркестр і апладысменты. Жаночая група падтрымкі з Кіраўскага раёна сустракала сваіх спартсменаў вершаванымі прывітаннямі.

У першым старце для абласнога і раённага кіраўніцтва самай хуткай сярод жанчын стала **старшыня Камітэта па працы і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама Святлана ТАРАСЕНКА**.

— Суперніцы сышлі з дыстанцыі, не вытрымалі, — весела тлумачыла пераможца свой поспех.

Святлана Тарасенка не першы раз становіцца лідарам спартыўнага лыжнага свята. Але галоўнае на лыжні, лічыць яна, не прызавыя месцы, а добры, нават алімпійскі настрой.

— Лье на галаву? Пра што вы гаворыце? Дождж і снег, таму адчуваю сябе як у Ванкуверы! — жартавала лыжніца. — Я са спартыўнай сям'і, і адночы нават скокнула з трамплiна на лыжах, каб паказаць мужу-спартсмену на што я здатная! І сёння ў мяне алімпійскі настрой, тым больш, што ўвесь наш камітэт выйшаў на лыжню: хто добра працуе, той і адпачывае актыўна.

Салдацкая каша, падняцце гары, перацягванне каната, святочны гандаль — усё гэта не давала сумавець публіцы. Аднак многія заўзятыя аматары лыжаў канцэнтраваліся толькі на спаборніцтвах.

У **Людмілы МІХНОВАЙ** з каманды Клімавічаў асаблівае стаўленне да лыжнага спорту: яшчэ школьніцай яна пазнаёмілася са сваім будучым мужам менавіта ў лыжнай секцыі. Людміле за 50 гадоў, але яна і цяпер узімку ездзіць да дачкі ў госці з лыжамі.

— Так, цікавасць засталася да гэтага віду спорту, — усміхаецца Людміла Іванаўна. — Радуе, што ў нашым Клімавіцкім раёне лыжны спорт на высокім узроўні, мае добрую базу. Я працую ва ўпраўленні па працы і занятасці райвыканкама: працы шмат, але ў выхадны дзень заўсёды імкнуся з унукамі на лыжах пабегаць! І сёння пабягу свой кіламетр з задавальненнем, чаго і ўсім жадаю!

Ілона ІВАНОВА.

І НІДЗЕ НЕ ЗЛІПЛАСЯ

Непрацуючы, раней судзімы 33-гадовы жыхар Гомеля з прылаўка на цэнтральным рынку горада адкрыта выкраў пакунак жавальнай гумкі — 30 штук. Відаць, здабычу ён усё ж паспеў ператравіць, бо, калі грамадзяніна затрымалі за іншае злачынства, выкрадзенае на рынку канфіскавана не было. А вось невядомага, які выкраў з закрытага ралета на рынку ў Жлобіне мужчынскія сарочкі ў асартыменце, міліцыя пакуль шукае. Між тым, тэрыторыя рынку знаходзіцца пад аховай вартаўніка, як і будоўля дома ў Мазыры. Там за ноч нечакана зніклі 129 радыятараў ацяплення і 154 тэрмарэгулюючых вентыляў на агульную суму больш за 4 мільёны рублёў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗНІКЛЫ МУЖ СПАТРЭБІЎСЯ ПРАЗ... 19 ГАДОЎ

Мужчына яшчэ ў 1991 годзе пайшоў з дому і не вярнуўся, а жонка звярнулася ў міліцыю з заявай толькі цяпер.

«Чаму толькі цяпер?» — запыталіся ў жанчыны ў міліцыі. Вымусілі мінчанку на гэта жыццёвыя абставіны. Як выявілася, дом, у якім прапісаны зніклы, будзе зносіцца, а для гэтага неабходная згода ўсіх прапісаных грамадзян. Вось выканкам і абавязаў гаспадыню дома знайсці свайго, па ўсім бачна, даўно забытага мужчыну.

Ігар ГРЫШЫН.

Лепшыя сядзібы года

ВЯСКОВЫЯ СЯДЗІБЫ РЫХТУЮЦЦА ДА ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ-2014

Газета «Звязда» ў якасці інфармацыйнага партнёра конкурсу «Лепшая аграсядзіба года» наведала сядзібы-пераможцы ў абласцях

ВЯСКОВЫ турызм, разам з лекавым, летась стаў найбольш паспяховым праектам у турыстычнай сферы Беларусі. Усе яго паказчыкі павялічыліся ўдвая (на фоне таго, што ў астатніх відах турызму справы складаліся далёка не бліскуча). Цяпер, калі аграэкатурызм набыў бурнае развіццё, самы час паклапаціцца пра яго якасць. Бо разам з масавасцю звычайна поруч крочыць дыскрэдытацыя.

З мэтай паўплываць на якасць паслуг, стварыць для аграсядзібаў арыенціры, два гады таму Белаграпрамбанк разам з аб'яднаннем «Адпачынак у вёсцы» і пры актыўным удзеле газеты «Звязда» заснаваў Рэспубліканскі конкурс «Лепшая сядзіба года». На сёння па выніках 2009 года ўжо вызначаны сядзібы-пераможцы ў кожнай вобласці. Аргкамітэт разам з членамі журы, арганізатарамі цырымоніі ўзнагароджання (Святочнае агенцтва Ларысы Грыбалёвай) і інфармацыйнымі партнёрамі наведалі некаторыя з іх. І што ж яны ўбачылі?

«ЗЯЛЁНАЯ СЯДЗІБА» НЕ ТОЕ Ж, ШТО І ЛАНДШАФТНЫ ДЫЗАЙН

У конкурсе па Мінскай вобласці ўзялі ўдзел 37 сядзібаў з 214 зарэгістраваных. На рэспубліканскі этап выйшлі пяць пераможцаў у пяці намінацыях. **«Дамелька» ў Смалявіцкім раёне** заняла першае месца ў намінацыі *«Зялёная сядзіба»*.

Яшчэ ў аўтобусе кожны з экспертнай групы атрымаў ад прадстаўніка банка распрацаваную шкалу крытэрыяў і ведаў, чаго трэба чакаць ад «Дамелькі». Падтрыманне экалагічна чыстай сельскай гаспадаркі, выкарыстанне экалагічных матэрыялаў і традыцыйных тэхналогій у будаўніцтве, ашчаднае выкарыстанне вады і энергіі, забеспячэнне гасцей інфармацыяй пра мясцовую прыроду, культуру, архітэктуру, аргінічную сельскую гаспадарку...

Таму мы некалькі засмуціліся, калі ўбачылі два шыкоўныя трохузроўневыя катэджы, абшытыя... сайдынгам. А калі пазней даведаліся, што сама мала адзін з іх, гасцявы, плошчай у 210 кв. метраў, ацяпляецца электрычнасцю, то засмучэнне пераўтварылася ў незразумеласць.

«Дамелька» аказалася насамрэч вельмі сімпатычнай сядзібай. Чаго вартая адна толькі тэрыторыя памерам у гектар, якая тэрасамі спускаецца да сасновага лесу і захоплівае яго частку. Нават зімой яна ўражвае. Дадайце да гэтага камфартабельны дом з більярдам на камянях (профі ведаюць, што гэта такое), фінскай саўнай на дровах, басейнам з падагрэвам і падсветкаю, кухняй, рускай печчу і пасудамыечнай машынай, трыма спальнямі, гасцёўняй, спадарожнікавым TV...

Адметнасць сядзібы «Ганка» — жывая музыка і цікавыя сустрэчы. Гасцей сустракаюць мастак, музыка і батлейнік Алесь ЛОСЬ (скрыпка) і гаспадар Анатоль ГАНЕЦ (акардэон).

Аднак пры ўсёй гэтай раскошы, сапраўды добрым гусце ў афармленні інтэр'еру (вось дзе ў кічы не абвінаваціш!) цяжка было знайсці адпаведнасці крытэрыям «зялёнай». Міжволі ўзнікла падазрэнне, што журы абласнога конкурсу альбо не наведвала сядзібу, альбо не разумее, што маецца на ўвазе пад гэтым азначэннем.

— «Зялёная» — гэта тое ж, што і экалагічная, а гэта несумяшчальнае ні з сайдынгам, ні з электрычным ацяпленнем, няхай там будзе самы шыкоўны ландшафтны дызайн, — заўважыла эксперт, **доктар філасофскіх навук, дырэктар Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра (IBB) Астрыд ЗАМ.** — Магчыма, «Дамелька» ў іншай намінацыі магла б быць высока ацэненая, але назваць яе «зялёнай» нельга.

Некаторыя неад'емныя элементы «зялёнай» сядзібы ў «Дамелькі» ёсць. Напрыклад, цяплічкі і градкі, на якіх вырошчваецца зеляніна да стала, а таксама сад. Але на гэтым уся сельская гаспадарка заканчваецца. Падобна, што і экскурсійная праграма (побач Раўбічы, Сілічы і Лагойск) мае зусім іншую накіраванасць.

Разам з тым, на сядзібе ёсць сапраўдная іскрынка — майстэрня па фларыстыцы. Аказалася, што **гаспадыня Ганна КІДРУН** — пераможца міжнароднага конкурсу па гэтым відзе прыкладнога мастацтва. Калісьці яны з мужам мелі ўласную крамку па продажы сувеніраў, а цяпер гатовыя ладзіць майстар-класы па фларыстыцы для гасцей. Засталося толькі дачакацца часоў, калі ў гасцей, якія прыязджаюць сюды, паміж барбекю, саунай і більярдам, знойдзецца на гэта час.

ФІТАПАРАСАЎНА І РЭЦЭПТ ПРЫГАЖОСЦІ

Фітапарасаўну мы ўбачылі, прычым многія — упершыню ў жыцці. А рэцэпта прыгажосці, які быў абяцаны ў крытэрыях да намінацыі «*Здаровы лад жыцця*», так і не дачакаліся.

Па Мінскай вобласці ў гэтай намінацыі заняла першае месца **сядзіба «Глінская» ў Барысаўскім раёне**. Спачатку падумалася, што першае мае на ўвазе другое. Пасядзеў у бочцы — выйшаў папрыгажэлы, аднак не. **Гаспадар Алег Бяляеў** сказаў, што бочка для турыстаў не прызначаная. Яна, як і ўся мэбля ў сядзібе, зроблена на яго прыватным прадпрыемстве, але, у адрозненне ад мэблі, служыць свайго роду ўзорам. Маўляў, зацікавіліся — можаце замовіць. Напэўна таму і стаіць яна ў... сталоўцы.

Для турыстаў — традыцыйная рубленая лазня на дровах. «Вось гэта ўжо бліжэй да тэмы», — узрадаваліся эксперты. Аднак адной лазні (ды нават разам з бочкай) для перамогі ў намінацыі «За здаровы лад жыцця» недастаткова. Лазня — абавязковы элемент, але да яе павінен дадавацца шэраг дадатковых паслуг, напрыклад, адмысловы масаж, травяная гарбата, купанне ў палонцы, пешыя альбо веласіпедныя маршруты... Так, зрэшты, пазначана ў крытэрыях. Зноў непаразуменне.



Сядзіба «Глівінская». Нам яшчэ належыць навучыцца адрозніваць актыўны адпачынак ад здаровага ладу жыцця.

І зноў, як і ў папярэдняй сядзібе, узнікла ўражанне, што гаспадары пра пэўную накіраванасць у сваёй дзейнасці не клапоцяцца. Хоць Алег і выказаўся накшталт таго, што п'яных кампаній імкнецца пазбягаць. Але ён пабудаваў дом для прыёму турыстаў, лазню, альтанку, выкапаў сажалку, калодзеж... І ўсё. Алег сам, як гаспадар, не робіць ніякага акцэнту на прапагандзе здаровага ладу жыцця.

— У мяне там, — ківае ён у бок гаража, — маторная лодка і квадрацыкл ёсць. Можна экстрэмальную падлёдную рыбалку на шчупака арганізаваць. Аматары дзеля гэтага гатовыя па 30 долараў за гадзіну плаціць.

Магчыма. Але гэта адносіцца больш да актыўнага адпачынку, чым да здаровага ладу жыцця, заўважаюць эксперты. Да таго ж, квадрацыкл і маторная лодка забруджваюць паветра. А адно з галоўных прызначэнняў вясковага турызму — прывіць гараджанам ашчаднае стаўленне да экасістэмы. Пра падлёдную лоўлю шчупакоў эксперты, напэўна, не пачулі.

ТРАДЫЦЫІ ЛЕПШ ЗАХОЎВАЦЬ РАЗАМ

Для многіх экспертаў сядзіба **«Ганка» ў Валожынскім раёне** ўжо добра вядомая. Гаспадары **Анатоль і Ларыса ГАНЦЫ** сёлета запрашалі да сябе на Каляды БГА «Адпачынак у вёсцы» і іх сяброў і ладзілі для гасцей сапраўдны фэст. Сусед па сядзібе, вядомы даследчык музыкі, мультыінструменталіст Алесь Лось уразіў гасцей паказам батлейкі. Сам Анатоль Ганец правёў экскурсію па сядзібе, падчас якой прадэманстраваў камоду Шаляпіна і іншыя рарытэты. Потым госці прыгатавалі, згодна з традыцыяй, 12 страў і кожную ўласна абаранілі. Трэба сказаць, што ўсе, хто тады быў, у «Ганку» ўлюбіліся і не сумняваюцца, што гэта сядзіба справядліва перамагла ў Мінскай вобласці ў намінацыі «За захаванне беларускіх традыцый». Больш за тое, «Ганка» — адна з прэтэндэнтаў на гран-пры конкурсу.

— Бо яна адпавядае практычна ўсім патрабаванням узорнай сядзібы, — упэўнівала журналістаў «Звязды» **спецыяліст па турызме, кансультант БГА «Адпачынак у вёсцы» Марыя БАРЫНАВА.** — Тут не толькі прыгожае месца: возера пад вокнамі ў атачэнні бярозавага гаю. Не толькі камфортныя ўмовы: санвузел, водаправад, лазня, артэзіянская вада. І не толькі пэўная ізаляванасць і адасобленасць: сядзіба размешчана на дастатковай адлегласці ад суседзяў, па сутнасці гэта хутар. Самае галоўнае тое, што гаспадары стварылі на сваёй сядзібе нейкі культурны асяродак. Гэта ўжо не проста вясковая міні-гасцініца, гэта цэнтр, дзе збіраюцца цікавыя, унікальныя асобы. Той жа Алесь Лось са сваёй калекцыяй старадаўніх музычных інструментаў. Тая ж Кацярына Радзівілава, жанчына-дудар. Гісторык і знаўца традыцыйнай беларускай кухні Алесь Белы. Турысты, якія прыязджаюць сюды, з'язджаюць абавязкова духоўна ўзбагачаныя. Не проста адпачнулыя. А ёсць жа яшчэ і зялёныя маршруты, і экскурсіі ў Заслаўе і Ракаў, і задума стварэння музея піва...

Алесь Белы і на гэты раз далучыўся да Ганцаў. Батлейку, на жаль, ён не прывёз, затое, іграў на скрыпцы, а Анатоль — на старадаўнім італьянскім акардэоне, пакуль госці частаваліся хлебам-соллю з рук гаспадыні. Потым былі боршч, запечаная бульба з каўбасой, сала, застольныя песні. Для таго, каб госці ведалі словы, усім раздалі альбомы з тэкстамі. На жаль, беларускіх сярод іх не было.

— Ды ведае, ведае Анатоль мову, вершы на ёй піша, — заспакойвалі журналістаў «Звязды» эксперты.

Аднак у той дзень гаспадар з гасцямі на беларускай мове не размаўляў. Магчыма з далікатнасці, бо госці ў большасці былі рускамоўныя. Але ж сядзіба прадстаўленая ў намінацыі, якая мае на ўвазе валоданне і карыстанне ў стасунках з гасцямі менавіта беларускай мовай. Гэта як з прыродай для гараджан. Важна паказаць прыгажосць, каб у сэрцы нешта адгукнулася...

Сядзіба «Прылесце», бадай, адзіная, што найбольш адпавядала сваёй намінацыі. Наталля РУКШТА частуе экспертаў конкурсу трусяцінай з шампанскім і пельменямі з дзічыны.

«ДЗВЕ ХАКЕЙНЫЯ КАМАНДЫ Я ЎЖО РАЗМЯШЧУ»

Сядзіба **«Прылесце» ў Мінскім раёне** другі раз удзельнічае ў конкурсе. Летась яна атрымала спецыяльны прыз турысцкіх сімпатый (ноўтбук), бо яе наведвалі часцей за ўсіх сядзібаў у краіне. Лічбы, якія агучваў **гаспадар Сяргей РУКШТА**, здаваліся проста фантастычнымі. Але яго нататнік пацвярджаў — патрапіць сюды было магчыма, толькі запісаўшыся за некалькі месяцаў загадзя.

— Крызіс даў сябе адчуць, — ківае галавой Сяргей. — Сёлета ў тры дамы прыязджае столькі ж людзей, колькі летась у адзін. Давялося знізіць цану: калі раней яна была ў еўра, то цяпер у долараў. Сума 35 альбо 45 тысяч рублёў для студэнта стала вырашальнай.

У «Прылесце» едуць часцей за ўсё студэнты — адзначаць медыумы, капуснікі, выпускныя. Па-першае, блізка, — можна дабрацца на гарадскім транспарце. Па-другое, не даражэй, чым у іншых катэджах, затое гэты — незвычайны. Што бачна пры першым поглядзе на фотаздымак. Сяргей дабіўся такога эфекту, калі абліцаваў свае дамы каменем.

Сядзіба «Дамелька»: майстар-класы па фларыстыцы могуць стаць іскрынкай, калі з'явяцца турысты, якія гэта ацэняць.

— Але самае галоўнае, — кажуць самі студэнты, — посуд мыць не трэба! Мы як даведаліся, адразу вырашылі — толькі сюды. А так хацелі аднаразовы посуд купляць.

У якасці дадатковых паслуг — катанне на цюбінгах, саўна з купеллю, лазня на дровах, танцпляц са святламузыкай, тэнісны стол, трусы і этнаэкспазіцыя, альтанка, барбекю, вяндлярня...

Сёлета сядзіба «Прылессе» заняла першае месца па вобласці ў намінацыі «Гасціннасць». І трэба сказаць, яна ёй адпавядае. У дзень, калі эксперты прыехалі да Сяргея і Наталлі Рукштаў, тыя прымалі адначасова тры кампаніі: студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ, выпускнікоў 206-й сталічнай школы 2005 года і супрацоўнікаў нейкай фірмы. Пры гэтым кожная з кампаній, гэта было відавочна, адчувала сябе выдатна.

Больш за тое, гаспадары змаглі на высокім узроўні прыняць і экспертаў: пачаставалі пельменямі з дзічыны, трусам (з уласнага падворка) у шампанскім, бліначкамі, грыбамі і шмат чым яшчэ.

— У гэтай сядзібы свая мэтавая аўдыторыя, і гэта добра, — пракаментавала ўбачанае **старшыня праўлення БГА «Адпачынак у вёсцы» Валерыя КЛІЦУНОВА**. — Тых жа студэнтаў многія гаспадары сядзіб пазбягаюць прымаць. Моладзь ёсць моладзь, і добра, што ёсць чалавек, які працуе для яе.

Пра стаўленне гаспадара да гасцей і сваёй справы красамоўна сведчыць той факт, што Сяргей пашыў сабе традыцыйны касцюм, за які аддаў 700 тысяч рублёў. Касцюм атрымаўся даволі шляхетны.

— Неяк армяне ў мяне адпачывалі, дык за свайго прызналі, — смяецца Сяргей. — Я гэты касцюм заўсёды апранаю, як іду дагавор падпісваць і разлічвацца.

Але самае галоўнае, Сяргей і Наталля ўжо гатовыя да чэмпіянату свету па хакеі 2014 года. «Не ўсе ж госці будуць у гарадскіх гатэлях жыць, — кажуць яны. — Некаму захочацца і чыстым паветрам падыхаць, і па лесе пагуляць». Рукшты гатовыя прыняць сама мала — дзве хакейныя каманды.

— Вось яшчэ над тэрыторыяй папрацую, — дзеліцца планамі гаспадар...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.
Мінская вобласць.

Глыбінка

ГАЗ ЧАКАЛІ — ГАЗ ПРЫЙШОЎ

НАРАКАННІ на тое, што апальваць прыватныя дамы прыродным газам даволі дорага, даводзілася чуць часта. А хтосьці хоць і мае магчымасць падвесці да дома газ, усё ж аддае перавагу дровам і брыкету. Можа нават скласціся ўражанне, што газ для прыватніка губляе ранейшую прыцягальнасць.

На мінулым тыдні давялося прысутнічаць на справаздачным сходзе ў адным сельгаскааператыве. Вось на гэтым сходзе і прагучала просьба, каб у іх аграгарадок правялі прыродны газ.

Адказ з трыбуны прадстаўніка райцэнтра быў неакрэсленым. Маўляў, трэба падумаць, газ з кожным годам даражэе і не ўсе гаспадары будуць яго падводзіць. Магчыма, такая тэндэнцыя сярод некаторай часткі жыхароў і мае сваіх прыхільнікаў, але за лепшае будзе прааналізаваць сітуацыю з прыродным газам у Ганцавіцкім раёне, куды ён прыйшоў толькі тры гады таму.

— Напачатку насцярожанае стаўленне да газу было і ў нашых індывідуальных забудоўшчыкаў. Для газіфікацыі неабходна было стварыць кааператывы, арганізаваць людзей, каб яны захацелі падвесці газ да сваіх дамоў. З вялікай цяжкасцю ўдалося ўгаварыць гаспадароў уступіць у той першы кааператыў, а затым людзі агледзеліся і за 2007—2009 гады ў нас было створана 29 такіх кааператываў. Што датычыцца 2010 года, то тут выстраілася чарга з 14 кааператываў. Праўда, сёлета «Ганцавічырайгаз» здолее падвесці газ толькі ў палову з іх, — растлумачыў **намеснік старшыні райвыканкама Уладзімір ДАВЫДЧЫК.** Ён жа курыруе і газіфікацыю раёна.

А людзей найбольш хвалюе кошт газу, у якую суму выльецца яго падводка. І калі чалавек гаворыць, што за газіфікацыю дома яму давялося заплаціць 4-5 млн рублёў, то трэба пагадзіцца, што грошы вялікія. Але паслухаем Уладзіміра Давыдчыка.

— Нагадаю, што 70 % кошту газіфікацыі аплачвае дзяржава, а 30 % — індывідуальныя забудоўшчыкі, якія аб'яднаныя ў кааператыў. І шмат тут залежыць ад колькасці людзей у тым кааператыве. Напрыклад, калі на вуліцы працягласцю 300 метраў знаходзіцца 60 дамоў, то пракладка газамагістралі абыдзецца гаспадару значна танней, чым калі на такой вуліцы будзе 20 дамоў. За падводку газу ў нас плацілі прыкладна 1,5 млн. Але ж у кожным доме гаспадару неабходна выканаць вялікі аб'ём работы, каб адчуць усе выгоды ад газіфікацыі. Калі ў чалавека ёсць фінансавыя праблемы, то ён можа ўзяць крэдыт у банку пад 3 працэнты.

— Часам людзі не могуць зразумець, чаму чалавек, які жыве ў прыватным доме, за падводку газу павінен плаціць, а ў шматпавярховым — не.

— Тут не зусім дакладная інфармацыя. Сутнасць у тым, што ў многіх шматпавярховых дамах горада газавыя трубы былі пракладзеныя яшчэ за савецкім часам і па іх падаваўся ў кватэры звадкаваны газ, а з прыходам прыроднага газу засталося толькі пусціць яго па пракладзенай магістралі. А вось жыхары шматпавярховых дамоў, што ўзводзяцца ў апошнія гады, таксама аплачваюць падводку газу.

— Уладзімір Канстанцінавіч, сёлетняя зіма суровая і колькі даводзіцца плаціць у месяц за ацяпленне дома?

— У мяне дом у 100 кв. м і за ацяпленне плачу прыкладна 100 тыс. рублёў. Але ж шмат залежыць ад плошчы дома. Калі катэдж у тры паверхі, то, магчыма, чалавек і ў 200 тысяч не ўкладзецца. Ёсць пытанні і да гаспадара. У аднаго кацёл гарыць на «поўную губу», а другі рэгулюе агонь у залежнасці ад тэмпературы за акном, яго дом уцеплены і вецер па пакоях не гуляе.

З газіфікацыяй — як з пакупкай пральнай машыны. У жанчыны вялікая сям'я, а бялізну мые рукамі, хоць унуку купіла камп'ютар, паставіла металічныя дзверы і пластыкавыя вокны ў кватэры. «А хіба ж машына так добра памые, як сама рукамі?» — казала іншым разам гаспадыня. А вось калі ўсё ж набыла пральную, то ўсім суседзям і знаёмым паўтарала: «Такая выгода, сама памые, выпалашча і адцісне, але парашку шмат есць!»

Нешта падобнае і з газам. Купіць трэба ацяпляльны кацёл, расшыральны бак, трубы, радыятары, калонку, заплаціць за мантаж... і пяці мільёнаў няма, але ж у доме — гарачая вада, ванна і цеплыня. За выгоду неабходна плаціць і добра, што людзі пачалі разумець гэта. Інакш у чаргу на газіфікацыю сваіх дамоў не станавіліся б.

Пры пракладцы газамагістралі раней узнікалі паміж гаспадарамі дамоў непаразуменні, якія часам выліваліся ў скандалы. Здаралася, што некалькі гаспадароў адмаўляліся ўдзельнічаць у пракладцы трубаў па вуліцы, а калі магістраль была праведзеная, то пісалі заяву ў гаргаз і падводзілі газ у свае дамы на «халяву». Ці бываюць такія выпадкі сёння?

— Пры стварэнні аднаго кааператыва пяць чалавек адмовіліся ад газіфікацыі. Калі ж да 35 дамоў газ быў падведзены, то тыя пяць агледзеліся і таксама захацелі газіфікавацца. Толькі цяпер дармавы варыянт не праходзіць. «Адказнікам» давялося заплаціць грошы кааператыву, якія затым былі падзеленыя паміж 35 гаспадарамі — тымі, хто заплаціў за пракладку трубаў. Пытанне адрэгуляванае, — адказаў **галоўны інжынер райгаза Дзмітрый МІНІЧ.**

— А калі глядзець шырэй, то што дала газіфікацыя раёну?

— Да падвядзення прыроднага газу наша гаспадарка з'яўлялася планава стратнай. Неабходна было рэгулярна падвозіць звадкаваны газ і напаўняць ім ёмістасці. У месяц тады страты дасягалі 80 млн рублёў, а сёння сітуацыя нармалізавалася. Насельніцтва горада забяспечваецца бесперабойна гарачай вадой. Не будзем забываць, што прыродны газ не такі небяспечны, як звадкаваны. Ужо на газ пачалі пераходзіць прамысловыя прадпрыемствы горада. Газ пайшоў і на перыферыю раёна. Прыродны газ падведзены ў аграгарадкі Кукава і Агарэвічы. Газіфікацыя раёна працягваецца.

Застаецца толькі дадаць, што Ганцавіцкі раён быў апошнім на Брэстчыне, куды прыйшло блакітнае паліва, і палешукі ўжо ацанілі яго выгаду. А за выгаду, як мы ведаем, трэба...

Сымон СВІСТУНОВІЧ, фота аўтара.
Ганцавіцкі раён.

«НЕ ГАНІ НА «МІНІ»!»

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Акцыю пад такім дэвізам правялі супрацоўнікі сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі з аматарамі аўтамабіляў «Міні Купер».

У нядзелю прыкладна 70 уладальнікаў «Міні Куперaў» з Беларусі, Украіны і Расіі выехалі на Мінскую кальцавую аўтадарогу. На працягу больш як 50 кіламетраў яны ў суправаджэнні патрульных аўтамашын ДАІ рухаліся з максімальна дазволенай хуткасцю — 90 кіламетраў у гадзіну. Ехалі адначасова па трох палосах, тым самым стрымліваючы «шумахераў».

Удзельнікі аўтапрабегу ў чарговы раз нагадалі калегам-кіроўцам, што «цішэй едзеш, далей будзеш». Толькі за мінулы год на вуліцах сталіцы з-за перавышэння хуткасці адбылося 198 аварый, у выніку якіх загінула 27 і параненa 242 чалавекі. Паводле слоў **старшага інспектара аддзела агітацыі і прапаганды УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Юрыя КРАСНОВА**, больш за ўсё пешаходаў у Мінску загінула летась менавіта па віне ліхачоў.

Надзея ДРЫЛА.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ЛИДСЕЛЬМАШ»

29 МАРТА 2010 ГОДА СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ЛИДСЕЛЬМАШ», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70.

Повестка дня собрания:

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2010 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2009 году.
3. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли и расходов на потребление, выплате дивидендов за 2009 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2010 год.
7. Об утверждении изменений в Устав Общества.
8. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
9. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
10. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Начало работы собрания **в 16.00.**
Регистрация участников собрания **с 15.00 до 15.50.**

Наблюдательный совет ОАО «Лидсельмаш».

УНП 500021638.

КАНЦА ЎДАСКАНАЛЕННЯ НАРМАТЫЎНАЙ БАЗЫ НЕ БУДЗЕ НІКОЛІ, ПАКУЛЬ РАЗВІВАЕЦЦА САМО БУДАЎНІЦТВА

Укараненне ў Беларусі еўрапейскіх стандартаў дазволіць забяспечыць пашырэнне экспарту будаўнічых матэрыялаў і зняць тэхнічныя бар'еры пры рэалізацыі інвестыцыйных праектаў на тэрыторыі краіны

Усе мы абсалютна розныя, але ўсе мы павінны з чым-небудзь жыць. Нашы камфортныя існаванні з'яўляюцца бяспека. Яна заўсёды была, есць і застанецца адным з чалавечых прыярытэтаў. Для нас выключна важнае значэнне мае бяспека дома, дзе мы працуем, офіса (завода, фабрыкі), дзе мы працуем, школы (сядка), кудых ходзяць нашы дзеці.

Надзейны, камфортны будынак — гэта вынік калектыўных намаганняў праекціроўшчыкаў, будаўнікоў, вытворцаў будаўнічых матэрыялаў. Для захавання якасці «канчатковага прадукту» на ўсіх этапах — ад распрацоўкі дакументацыі да адпрацоўкі работ — павінны выконвацца вызначаныя нормы і стандарты. Сёння наша размова пойдзе пра арганізацыю, якая з'яўляецца базавай структурай Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь, якія мае правядзіць кожны год на Дзень будаўніка і не толькі. Цялер у нас ёсць ідэя, калі пацяплее, распачаць практыку турыстычных злётаў у межах свайго арганізацыі. Гэта пасляшае далейшаму ўмацаванню нармальнага маральнага клімату, дасць людзям магчымасць больш з'яднацца. Асобныя кірункі дзейнасці нашых аддзелаў часта звязаны паміж сабой і без разумення, без нармальнага мікраклімату абысціся цяжка. Усе нашы супрацоўнікі пастаянна знаходзяцца ў кантакце. Таму і людзі, якія не ўпісваюцца ў калектыў, як правіла, у нас не прыжываюцца.

Галоўны інжынер Ігар ЛІШАЙ.

Інжынер Іна ЛАЙКОЎСКАЯ рыхтуе ўзоры пліўнічных плёнак да выпрабаванняў.

Намеснік дырэктара па сертыфікацыі і выпрабаваннях Дзмітрый КАЎШЫРКА.

Намеснік начальніка аддзела сертыфікацыі СМІ і ацэнкі тэхнічнай кампетэнтнасці выпрабавальнікаў лабараторыі Святлана КАРНЕЕВА (у цэнтры) і супрацоўнікі аддзела інжынераў Вольга АРЛОЎ, аддзелы спецыялістаў Яўгенія СЛЯПЦОВА, аддзелы інжынераў Таццяна БАЛДОУСКАЯ, інжынер Вольга БУРЫКІНА.

— Таксіп паліэрныя трубы таксама выпрабаванне у нашым цэнтры, — кажа начальнік сектара Наталля ЧАХОВІЧ.

— У сувязі з гэтым, напэўна, будзе лагічным расказаць пра ўкараненне ў нашай краіне еўрапейскіх нормаў і стандартаў?

— Безумоўна, гэта напрамую звязана з папярэдніх пытанням. На пачатку мінулага года кіраўнікі дзяржавы і Саветам Міністраў вырашылі ўдасканаліць сістэму тэхнічнага рэгулявання, прыняць шэраг мер, накіраваных на ліквідацыю бюракратычных перашкод, якія існуюць у гэтай галіне. Прадугледжвалася, што ў ліку такіх мер будзе і ўкараненне еўрапейскіх стандартаў. Гэта важна было зрабіць, каб прадукцыя беларускіх вытворцаў была канкурэнтаздольнай на рынках Еўрапейскага Саюза, — стаяла на адным з першых месцаў. Гэта дазволіць нашым вытворцам пашырыць экспарт будаўнічых матэрыялаў, зняць тэхнічныя бар'еры пры рэалізацыі інвестыцыйных праектаў на тэрыторыі краіны.

Для выражэння пастаўленай задачы спачатку быў праведзены дэталёвы аналіз вопыту краін — членаў Еўрапейскага саюза. Мы падрабязна вывучалі гэтае пытанне ў Аўстрыі, Германіі, Польшчы, Літве і выявілі, што ў кожнай краіне свае нацыянальныя асаблівасці, свая неаднаковая сістэма нарматавання. Адзінага падыходу ў фарміраванні такога комплексу тэхнічных дакументаў у будаўніцтве ў Еўрапейскім саюзе на сёння няма. Кожная краіна адназначна ідзе сваім шляхам, але існуюць пэўныя межы гарманізацыі — па асобных кірунках. У прыватнасці, сёння ў Еўрапейскім саюзе завяршаецца ўкараненне адзіных падыходаў да праектавання будаўнічых канструкцый. Распрацавана 58 так званых Еўрапейскіх (еўрапейскіх стандарты), якія з'яўляюцца агульным для ўсіх краін Еўрапейскага саюза правілам праектавання канструкцый з розных матэрыялаў (жалезабетону, дрэва, металу). Усе 58 Еўракодаў былі адаптаваны, перапрацаваны і з 1 студзеня гэтага года ўведзеныя ў дзеянне ў якасці нацыянальных дакументаў Рэспублікі Беларусь у галіне будаўніцтва.

У Еўрапейскім саюзе існуе Дырэктыва 89/106 ЕЭС, якая прадугледжвае бязбар'ернае абарачэнне пэўных будматэрыялаў, прызнаных бяспечнымі, па усіх краінах Еўрапейскага саюза. Дырэктыва вызначае асноўныя патрабаванні бяспекі, якія павінны пад'яўляцца да будаўнічых матэрыялаў. Бяспечны тавар атрымлівае СЕ-маркіроўку. Наяўнасць СЕ-маркіроўкі азначае, што матэрыял адпавядае еўрапейскім патрабаванням бяспекі, якія сёння прад'яўляюцца да гэтага віду прадукцыі.

Есць яшчэ такое паняцце, як «гарманізаваны еўрапейскі стандарт» (стандарт, які гарманізаваны з вышэй згаданай Дырэктывай). На практыцы гэта азначае, што тавар, выраблёнены на гэтым стандарце, абавязкова будзе адпавядаць і патрабаванням Дырэктывы. Стандарт з'яўляецца даказальнай базай для адпаведнасці Дырэктывы. На тавар, які стандарты мы арыентавалася на працэсу апошніх пяці гадоў, і таму шэраг аналагічных дакументаў у Беларусі дагэтуль ужо ўведзены ў якасці нацыянальных стандартаў. Для параўнання: у еўрапейскай, рэзка скарацілі колькасць абавязковых прыватных дакументаў і перавялі ў дакументы рэкамендацыйнага характару.

Па агульнасці мы ўкаранілі — распрацоўку і ўкараненне адпаведных праграм у сістэме вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі кадраў, правядзенне «круглых сталоў», навуковых семінараў, міжнародных канферэнцый.

У галіне ўкаранення стандартаў Еўрапейскага саюза на прадпрыемствах прамысловасці будаўнічых матэрыялаў і будіндустрыі — карэкціроўку тэхналогіі і перавастаўленне выпрабавальнага і заводскіх лабараторый, перапрацоўку тэхналагічнай дакументацыі. Для гэтых мэтаў будуць прыцягнуты ўласныя сродкі прадпрыемстваў і навабашнія фонду.

Рэалізацыя комплексу мерапрыемстваў па пераходзе ў ўкараненні ў Рэспубліцы Беларусь стандартаў ЕС на аналогі з краінамі — членамі ЕС дазволіць забяспечыць пашырэнне экспарту будаўнічай прадукцыі і паслуг у краіны Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, а таксама знець тэхнічныя бар'еры пры рэалізацыі інвестыцыйных праектаў на тэрыторыі краіны.

Намеснік дырэктара па сертыфікацыі і выпрабаваннях Дзмітрый КАЎШЫРКА.

— І са стварэннем адзінага Мытнага саюза тэхніі адносіны толькі ўмацаюцца. У сувязі з гэтым, захаванне ў нацыянальнай сістэме тэхнічнага нармавання і стандартызацыі нормаў праектавання будаўнічых канструкцый і стандартаў, заснаваных на сістэме нармавання былога СССР, забяспечыць магчымасць узаемнага супрацоўніцтва паміж членамі СНД, у тым ліку і экспарт беларускай будаўнічай прадукцыі і паслуг у тэрыторыі краіны, а таксама знець тэхнічныя бар'еры пры рэалізацыі інвестыцыйных праектаў на тэрыторыі краіны.

— Я сказаў бы, што нас яна закранула у меншай меры, толькі ў частцы карэкціроўкі існуючых нарматыўных дакументаў, каб можна было забяспечыць новыя падыходы да вырашэння пастаўленай задачы. Мы пастаянна здзяйсняем манітарынг, пры неабходнасці ўносім у свае нарматыўныя дакументы адпаведныя змяненні, каб нічога не перашкаджала рэалізацыі праграмы будаўніцтва жылля.

— Ведаю, што вы зарэгістраваны ў асацыяцыі «Русский регистр». Што вам гэта дае?

— Мы атрымалі гэты сертыфікат, каб пакazаць, што наша арганізацыйная структура, менеджмэнту знайшла прызнанне і з боку замежных экспертаў, і што наша арганізацыя валодае дастатковымі прафесійнымі якасцямі, каб пастаянна забяспечваць высокую якасць сваёй прадукцыі (тэхнічных нарматыўных прадпісанняў). Адзначу яшчэ, што мы самі сертыфікуем сістэму менеджмэнту якасці іншых арганізацый (у нас ёсць адпаведная акрэдытацыйная дакументацыя).

— Раскажыце, хто ажыццяўляе кантроль за распрацаванымі вамі тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі, правярае іх актуальнасць?

— Мы самі пастаянна ажыццяўляем праверку нашых тэхнічных дакументаў, каб нарматыўная база не будзе ніколі, пакуль будзе развівацца само будаўніцтва. Тое, што стварылі раней, можа быць удасканалена, на выкліках нівэліравана. У цэлым адзначу, што мы на сёння стварылі дзесці збалансаваны комплекс дакументаў, які дазваляе нам і на Еўрапейскі саюз падаваць разгулявацца тарыфны будаўніцтва, выконваць поўныя работы з вымяранні, зрабіць дакументацыю ранда дасканалай, на нарматыўнай базы

Радавыя Перамогі

ЗА ЛЕЛЬКУ-АТАМАНА — ГРОШЫ, КАРОВА І ЛІТР ГАРЭЛКІ...

У гады Вялікай Айчыннай вайны на акупаванай тэрыторыі Беларусі дзейнічалі тысячы партызанскіх атрадаў і спецыяльных чэкісцкіх груп. Яны пусцілі пад адхон сотні эшалонаў, разгрымелі дзясяткі варожых гарнізонаў, забілі сотні тысяч гітлераўцаў. За мужнасць і гераізм тысячы народных мсціўцаў былі ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі, многім з іх прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Сярод такіх — разведчыца, камандзір жаночай дыверсійнай групы спецыяльнага прызначэння, Герой Савецкага Саюза Алена Фёдараўна Колесава.

...За 5 месяцаў атрад Колесавай вынішчыў некалькі варожых эшалонаў, аўтамашын, мост, разбурыў шэсць варожых гарнізонаў. У адзін з летніх дзён пераапрануты ў сялянскае адзенне Алена на вачах у вартавога падарвала каштоўны варожы эшалон з тэхнікай. За затрыманне атамана-дэсантніцы Лелькі («высокая, здаровая, гадоў 25, з ордэнам Чырвонага Сцяга») абяцалі 30 тысяч марак, карову і літр гарэлкі. Доўга віселі гэтыя аб'явы каля валасных управленняў, на дамах старастаў. Людзі чыталі і ўсміхаліся: паспрабуй, злаві нашу партызанку! І ніхто не ведаў аб тым, што ў атрадзе, якім камандавала дзяўчына, было ўсяго некалькі чалавек...

Алена нарадзілася ў 1920 годзе ў вёсцы Колесава Яраслаўскай вобласці, у шматдзетнай сялянскай сям'і. З васьмі гадоў жыла ў Маскве. Пасля сямігодкі скончыла Маскоўскае педагагічнае вучылішча, працавала настаўніцай, была піянерважатай.

З першых дзён вайны ўступіла ў народнае апалчэнне Масквы. Працавала на будаўніцтве абарончых збудаванняў, скончыла курсы санітарных сясцёр. У кастрычніку 1941 года пасля двух беспаспяховых спроб Алену прынялі ў групу маёра Артура Карлавіча Строгіса — асобага ўпаўнаважанага разведаддзела штаба Заходняга фронту. У гэтай групе яна і прайшла спецыяльную падрыхтоўку, вывучыла мінную справу, айчынную і трафейную стралковую зброю.

Да першага баявога задання Алена прыступіла ў кастрычніку 1941-га. У складзе групы мініравала дарогі, вынішчала склады з гаручым, лініі сувязі, вяла разведку ў раёне чыгуначных станцый Тучкава, Дорахава, вёскі Старая Руза Маскоўскай вобласці. Пазней разведчыца расказвала: «Упершыню ў тыл ворага мы пайшлі 28 кастрычніка. Было нас чатыры дзяўчыны і чатыры хлопцы. Групу ўзначальваў Барыс Удалаў, які дагэтуль ні разу не бываў за лініяй фронту. І ўсе мы, безумоўна, дрэнна ўяўлялі сабе, як усё гэта будзе. У рэчавыя мяхі паклалі патроны, міны і тол уперамешку з сухарамі. Ад гэтага сухары потым сталі горкімі...».

Па вяртанні Алена прапанавала стварыць уласную дзявочую групу. Камандаванне ідэю падтрымала. Была створана дыверсійная група з дзевяці дзяўчат. Кожнай далі мянушку — Бабулька, Рыбачка, Казак... Алену ж ахрысцілі Алёша-Атаман.

Хутка паступіла і заданне. Атрад Колесавай 18 сутак вёў разведвальную работу, мініраваў дарогі ў раёне Акулава-Крабузіна... У тыле Алена з сяброўкай трапілі ў палон. Нямецкі афіцэр звярнуў увагу на іх новыя боты і лыжныя штаны. Іх дапыталі, упіхнулі ў калону ваеннапалонных і пагналі на захад. У нямецкім штабе, праўда, адпусцілі, і хутка дзяўчаты ўжо былі ў лесе. Ім удалося перайсці лінію фронту і вярнуцца на базу. Нягледзячы на няўдачу, яны сабралі нямала цікавых звестак аб размяшчэнні гітлераўцаў, іх баявой тэхніцы, складзе воінскіх часцей, якія ішлі да фронту, і нават аб асаблівасцях штабнога жыцця гітлераўцаў.

У студзені 1942 года на тэрыторыі Калужскай вобласці зводны атрад разведаддзела штабу Заходняга фронту ў складзе 9 чалавек, у якім была Колесава, уступіў у бой з варожым дэсантам. Група выканала задачу і затрымала ворага да падыходу часцей 10-й арміі. Алена асабіста вынесла з поля бою раненую сяброўку. Усе ўдзельнікі бою былі ўзнагароджаны. 7 сакавіка 1942 года ў Крамлі старшыня УЦВК СССР Міхаіл Калінін уручыў Алене Колесавай ордэн Чырвонага Сцяга.

У ноч на 1 мая 1942 года дыверсійна-партызанскую групу з 12 дзяўчат пад камандаваннем Лелькі-атамана скінулі на парашутах у Барысаўскім раёне Мінскай вобласці. Прызямленне прайшло няўдала. Тры дзяўчыны разбіліся падчас прызямлення, адна зламала пазваночнік, дзве трапілі ў гестапа. Сувязныя не выйшлі на сустрэчу. Як потым высветлілася, групу выдаў здраднік.

Нягледзячы на страты, у першых чыслах мая група пачала баявыя дзеянні. У лесе была заснавана база, устаноўлена сувязь з камандзірам партызанскай брыгады Віктарам Лівенцавым. Дзяўчаты ўзрывалі масты, пускалі пад адхон воінскія эшалоны з гітлераўцамі і ваенную тэхнікай, нападалі на паліцэйскія ўчасткі, рабілі засады. Хутка ў атрад пачалі паступаць мясцовыя жыхары.

Да верасня колькасць байцоў у групе Алены дасягнула пяцідзесяці. Акрамя дыверсій, вялася разведка ў Барысаве, была ўстаноўлена сувязь з мясцовым падполлем. Незадоўга да гэтага Лелька атрымала другую баявую ўзнагароду — ордэн Чырвонай Зоркі.

11 верасня 1942 года пачалася сумесная партызанская аперацыя па вынішчэнні фашысцкага гарнізона вёскі Выдрыцы. Актыўны ўдзел у гэтым узяла група Колесавай. Напярэдадні Алена дзяжурыла па лагеры і не павінна была ісці на заданне. Але яна не хацела заставацца, рвалася ў бой. «У нас асабістыя рахункі з гэтым гарнізонам, — гаварыла Леля. — Там схапілі нашых дзяўчат — Тоню і Сашу». Строгіс дазволіў ісці на заданне і радасная Лелька забегла ў палатку: «Іду, дзяўчаты! Будзем помсціць за сябровак!».

...Пазней партызаны расказвалі, што Леля ішла на заданне радасная, жартавала. Калі пачаўся бой, была наперадзе атакуючых партызан. Перабягала ад дома да дома, вяла агонь з аўтамата. Калі дыск скончыўся, прыўзнялася, каб дастаць другі і...упала. Пад агнём яе аднеслі за дом, перавязалі рану... Але куля трапіла ў грудную клетку. Леля ціха прамовіла: «Пакіньце мяне... Ідзіце біць немцаў... Я тут паляжу адна». Калі прыйшла ў свядомасць, мовіла апошняе: «Як цяжка паміраць, ведаючы, што так мала зроблена. Беражыце маіх дзяўчат і пахавайце мяне ў Мігаўшчыне, там, дзе нашы ляжаць...».

Вестка аб гібелі «атаманшы» імгненна разнеслася сярод партызанаў. З гэтай весткай яны і вынішчылі гарнізон.

Пахавалі Лелю ў той жа дзень у вёсцы Мігаўшчына. Развітацца з партызанкай прыйшлі байцы і камандзіры размешчаных паблізу атрадаў і груп.

За ўзорнае выкананне баявога задання ў тыле ворага Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 21 лістапада 1944 года Алене Колесавай прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

...У 1954 годзе астанкі Алены былі перанесены ў горад Крупкі, у брацкія могілкі, дзе пахаваныя яе баявыя сяброўкі. На радзіме партызанцы ўстаноўлены помнік, а на будынку педагагічнага вучылішча № 2 і школы № 47 г. Масквы ўладкаваныя мемарыяльныя дошкі. Імем Героя Савецкага Саюза Алены Колесавай названы сярэдняя школа № 2 у Крупках, а таксама вуліцы ў Маскве, Валгаградзе, Яраслаўлі і Крупках. Франтавыя пісьмы захоўваюцца ў архіве Інстытута гісторыі Расійскай Акадэміі навук.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Браты Мікалай і Раман ІВАНОВЫ служаць у роце Ганаровай варты Беларусі.

«ГАРАЧАЯ» ЛІНІЯ ЎПРАЎЛЕННЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ МІНАБЛВЫКАНКАМА

8 (017) 220 20 25

23 лютага — галоўны пазаштатны спецыяліст па дзіцячай эндакрыналогіі абласнога ўпраўлення аховы здароўя, урач педыятрычнага аддзялення Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Рабко Т.П.

24 лютага — намеснік галоўнага ўрача Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Зародава А.В.

25 лютага — загадчык аталарынгалагічнага аддзялення Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Сяцко А.П.

26 лютага — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Курсевіч В.В.

У графіку магчымыя змяненні.

АЙЧЫНА ПАД АБАРОНАЙ

У святочны дзень 23 лютага, пакуль цывільныя мужчыны атрымліваюць падарункі ад жанчын і чакаюць самай смачнай вячэры, салдаты са 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай Рагачоўскай Чырванасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава брыгады імя Вярхоўнага Савета БССР займаюцца самым адпаведным даце заняткам — абараняюць Айчыну.

Фота Паўла БЕРАСНЕВА.

24 марта 2010 года в 11 часов СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ДСТ № 4 г. БРЕСТ»

по адресу: г. Брест, ул. Калинина, 63 (конференц-зал, 3 этаж).

Повестка дня:

1. Отчет о работе Наблюдательного совета Общества за 2009 год.
2. Отчет дирекции Общества о деятельности по выполнению показателей финансово-хозяйственного плана за 2009 год.
3. Об утверждении бухгалтерского баланса Общества и распределения прибыли с учетом аудиторского заключения и заключения Ревизионной комиссии.
4. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
5. Об использовании прибыли в 2010 г.
6. О внесении изменений в устав Общества.
7. Об определении размеров вознаграждений и компенсации расходов членам Наблюдательного совета.
8. Об оказании спонсорской помощи.

Ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания акционеры (их представители) могут в приемной руководителя Общества по адресу: г. Брест, ул. Калинина, 63, с 12.03.2010 с 8.00 до 17.00 часов, кроме субботы и воскресенья.

Регистрация участников собрания будет производиться 24.03.2010 с 9.00 до 10.50. Для регистрации акционеру Общества необходимо иметь паспорт, а представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНН 200274482. **Наблюдательный совет.**

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

ОАО «Минскэнергострой» уведомляет акционеров:

В соответствии со статьей 78 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах» и по итогам проведения общего собрания акционеров (протокол № 15 от 16.02.2010 г.) акционеры, не участвующие 16.02.2010 г. в собрании акционеров ОАО «Минскэнергострой» или голосовавшие против принятия решения по вопросу повестки дня о реорганизации ОАО «Минскэнергострой», имеют право предъявлять обществу требования о выкупе на баланс принадлежащих им акций. На собрании акционеров утверждены следующие условия приобретения Обществом акций собственного выпуска на баланс по требованию акционеров:

Полное наименование и местонахождение эмитента	Открытое акционерное общество «Минскэнергострой»
Адрес, по которому будут приниматься заявления акционеров с требованием выкупа и заключаться договора купли-продажи акций	г. Минск, ул. Монтажников, 39
Срок, в течение которого предоставляются заявления с требованием выкупа акций	с 16.02.2010 г. по 19.03.2010 г.
Срок, в течение которого осуществляется приобретение акций	с 23.03.2010 г. по 24.04.2010 г.
Цена приобретения акций	15 000 рублей
Сроки, форма и порядок оплаты акций	В течение 30-ти банковских дней с момента зачисления на счет «депо» эмитента, путем выплаты наличных денежных средств из кассы Общества или по безналичному расчету путем перечисления денежных средств на счет продавца

Общая сумма денежных средств, направляемых Обществом на выкуп акций по требованию акционеров, не может превышать десяти процентов стоимости чистых активов акционерного общества на дату принятия настоящего решения.

В случае, если общее количество акций, предложенных для выкупа по требованию акционеров, превышает количество акций, которое может быть приобретено акционерным обществом с учетом указанного выше ограничения, акции выкупаются у акционеров пропорционально заявленным требованиям. УНП 100008291

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «БЕЛХИМ»

25 марта 2010 года состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «БЕЛХИМ», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Короля, д. 34.

Собрание пройдет по адресу:
Минский р-н, пос. Колодищи, ул. Чкалова, 58, Минская база ОАО «Белхим».

Повестка дня собрания:

1. Отчет об итогах финансово-экономической деятельности в 2009 году и основных направлений развития на 2010 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2009 году и 1-й квартал 2010 г.
3. Отчет Ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков.
5. Распределение чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2009 год.
6. Утверждение направлений использования остатка чистой прибыли на 2010 год и 1-й квартал 2011 г.
6.1. Утверждение основных расходов на потребление в составе внереализационных расходов.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. Утверждение размера вознаграждений членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Утверждение сметы командировочных расходов на 2010 год и 1 квартал 2011 года.
10. О внесении изменений в Устав.
11. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
12. Утверждение Положения о Наблюдательном совете ОАО «Белхим».
13. Утверждение Положения о Ревизионной комиссии ОАО «Белхим».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34 с 17 марта по 24 марта 2010 года (время работы с 9.00 до 16.30) либо 25 марта 2010 года по месту проведения собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 01 марта 2010 года.

Регистрация участников собрания 25 марта 2010 года с 13.00 до 15.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания 25 марта 2010 года в 15 часов 00 минут.

Для регистрации при себе иметь документы, удостоверяющие личность (паспорт).

УНП 100122846

Уведомление о созыве очередного общего собрания акционеров

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ПРИДНЕПРОВЬЕ», 26 МАРТА 2010 ГОДА СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ПРИДНЕПРОВЬЕ»

Собрание состоится в очной форме по адресу: г. Речица, ул. Строителей, 2а

Повестка дня собрания:

1. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках ОАО «Приднепровье» за 2009 год.
2. О распределении чистой прибыли Общества и выплате дивидендов за 2009 год.
3. Основные направления деятельности Общества и использование прибыли в 2010 году.
4. Избрание Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
5. О размере вознаграждений и компенсации расходов членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Голосование по всем вопросам повестки дня общего собрания акционеров будет проводиться бюллетенями для голосования.

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: г. Речица, ул. Строителей, 2а — приемная — с 22 по 26 марта 2010 года (время работы с 8.00 до 17.00).

Регистрация участников собрания с 16.00 до 16.45 по месту проведения собрания.

Начало проведения собрания — 26 марта 2010 года в 17.00 по адресу: г. Речица, ул. Строителей, 2а.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 1 марта 2010 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 400315195. **Наблюдательный совет ОАО «Приднепровье».**

ОАО «Хорошее настроение»

ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 26 марта 2010 г. ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится в ресторане «Гарлем Бит» в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Центральная, 6.

Повестка дня

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 г.
2. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества за 2009 г.
3. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2009 г.
4. Отчет Ревизионной комиссии Общества.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. Утверждение регламента работы с реестром владельцев ценных бумаг.

Для регистрации акционеров иметь при себе паспорт, для представителя акционера – доверенность и паспорт.

УНП 100097687. Наблюдательный совет.

ИЗВЕЩЕНИЕ

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ! ОАО «БЕЛФА» г. ЖЛОБИН ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 30 марта 2010 г. ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год и основные направления развития на 2010 год.
2. Отчет Ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год. Утверждение годового баланса и отчета о прибылях и убытках за 2009 год.
3. Об использовании чистой прибыли, полученной в 2009 году и выплате дивидендов за 2009 год.
4. Утверждение нормативов использования чистой прибыли на 2010 год.
5. О внесении дополнений в Устав Общества.
6. Об отмене решения очередного общего собрания акционеров от 31 марта 2009 г. по вопросу «О внесении изменений и дополнений в Устав Общества в части изменения наименования Общества».
7. О предоставлении юридическим лицам безвозмездной (спонсорской) помощи.
8. Утверждение размеров вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Собрание состоится в конференц-зале Общества по адресу: **Гомельская обл., г. Жлобин, Красный проезд, 2. Начало в 14.00.**

Регистрация участников собрания **с 12.00 до 13.45.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

Акционеру Общества – **паспорт**.

Представителю акционера – **паспорт и доверенность.**

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, составляется на основании данных реестра владельцев акций по состоянию **на 1 марта 2010 года.**

С материалами по проведению собрания можно ознакомиться по месту нахождения Общества **с 23 марта 2009 года.**

УНП 400076540. Наблюдательный совет.

У 1928 годзе самым каштоўным падарункам на 23 лютага была... саламарэзка!

ПАДЧАС падрыхтоўкі да святкавання 10-й гадавіны Чырвонай Арміі народны камісар сацыяльнага забеспячэння Беларусі 24 студзеня 1928 года накіраваў дакладную запіску ў Савет Народных Камісараў БССР наступнага зместу: *«...Я лічу неабходным, каб гэты дзень (23 лютага) быў адзначаны ўрадам у адносінах да інвалідаў грамадзянскай вайны, чырвоных партызанаў і непрацаздольных членаў сем'яў забітых або бязведама прапаўшых вышэйпамянёных грамадзян шляхам прыпаднясення ім падарункаў, хаця б на суму 5000 рублёў. Зыходзячы з таго, што большасць забяспечваемых знаходзіцца на вёсках, падарункі павінны адпавядаць характару патрэбнасцяў гаспадарчага жыцця».*

Далей у дакладной ідзе пералік сельскагаспадарчых прылад і названы цэны на іх набыццё. На кожную акругу (на той час у Беларусі было 8 акруг) меркавалася набыць: саламарэзак — 40, плугоў — 80, акучнікаў — 16, восяў жалезных — 16, піл папярэчных — 80, ботаў — 32 пары, чаравікаў — 40, палітонаў — 24. Усяго на суму пяць тысяч рублёў. Трэба адзначыць, што самай дарагой рэччу была саламарэзка. Яна каштавала сорак рублёў.

Гэтую дакладную запіску СНК БССР накіраваў у Народны камісарыят фінансаў рэспублікі, які 3 лютага 1928 года адрэагаваў наступным чынам: *«Прымаючы пад увагу, што, па-першае, набыццё і выдача падарункаў на 5000 рублёў для інвалідаў вайны пры існуючым велізарным ліку інвалідаў, разумела, не зможа ахапіць цалкам нават самых бяднейшых з іх, у сувязі з чым на месцах можа быць выклікана шмат непажаданых непаразуменняў. Па-другое, інваліды вайны ў 1927 годзе атрымалі 20 % павышэння ставак пенсій і, па-трэцяе, што ў часе юбілейных святаў Чырвонай Арміі галоўная ўвага павінна быць звернута на чырвонаармейцаў, якім у першую чаргу, па меры магчымасці, павінны быць зроблены падарункі. Пагэтаму Наркамфін не можа згадзіцца на водпуск гэтых сродкаў»*.

І усё ж інваліды Чырвонай Арміі — удзельнікі грамадзянскай вайны нейкім чынам былі адзначаны ўрадам. Пастановай ЦВК і СНК БССР ад 13 лютага 1928 года яны ў першую чаргу пры размеркаванні дзяржаўнай зямельнай маёмасці надзяляліся зямлёй, сенажацямі, садамі, агародамі. Народнаму камісарыяту сацыяльнага забеспячэння даручалася зрабіць усе захады для забеспячэння ў найбліжэйшы час магчыма большага ліку інвалідаў Чырвонай Арміі пратэзамі.

Акрамя таго, у 1928/1929 навучальным годзе выдзяляліся сродкі на атрыманне ў вышэйшых навучальных установах спецыяльных стыпендый у памяць дзесяцігоддзя Чырвонай Арміі для дзяцей вайскоўцаў.

23 лютага 1928 года ва ўсіх цэнтральных газетах краіны была змешчана адозва Цэнтральнага камітэта і Савета Народных Камісараў Беларускай ССР да рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі з прычыны дзесяцігоддзя яе існавання. У адозве праслаўляўся гераічны шлях Чырвонай Арміі і выказвалася ўпэўненасць у тым, што *«сваю задачу абароны нашага мірнага гаспадарчага будаўніцтва Чырвоная Армія ў кожную хвіліну гатова і можа выканаць»*.

Рэха вайны

60 НЯМЕЦКІХ МІНАЎ

Рыццё новага меліярацыйнага канала каля вёскі Малыя Аўцюкі ў Калінкавіцкім раёне нечакана часова прыпынілася. Як расказаў начальнік аддзялення тэрытарыяльнай абароны Калінкавіцкага раённага ваенкамата Юрый Козыр, работнікі заўважылі 3 металічныя скрыні. Як высветлілася, у іх знаходзілася 30 нямецкіх мінаў. Пасля таго, як супрацоўнікі ваенкамата забралі першую небяспечную знаходку, быў знойдзены аналагічны «скарб»: яшчэ тры скрыні з 30 мінамі. На сёння ўсё знойдзенае абяшкоджана сапёрамі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Уважаемые акционеры ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД»

24 МАРТА 2010 ГОДА СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД», РАСПОЛОЖЕННОГО ПО АДРЕСУ: Г. ЖАБИНКА, УЛ. КАЛИНИНА.

Собрание пройдет по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина, зал заседаний заводоуправления ОАО «Жабинковский сахарный завод».

Повестка дня собрания:

- Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и основных направлениях деятельности Общества на 2010 год.
- О работе Наблюдательного совета в 2009 году. Оценка деятельности директора Общества Наблюдательным советом.
- Отчет Ревизионной комиссии о результатах ревизии и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков и годовому отчету Общества. Ознакомление Общества с заключением аудитов.
- Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества за 2009 год.
- Утверждение порядка распределений чистой прибыли за 2009 год. О выплате дивидендов за 2009 год (размер и сроки выплаты).
- О направлениях использования чистой прибыли на 2010 год и 1 квартал 2011 года.
- Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
- О назначении вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
- Об утверждении задания по экономии материальных, трудовых и топливно-энергетических ресурсов в 2010 году.
- Утверждение регламента работы с реестром владельцев ценных бумаг ОАО «Жабинковский сахарный завод».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: в рабочие дни (понедельник — пятница), начиная с 13.03.2010 г. по 23.03.2010 г. по месту нахождения Общества г. Жабинка, ул. Калинина, заводоуправление (отдел кадров) с 8.00 до 16.30, 24 марта 2010 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 24 марта 2010 года, 13.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 25 февраля 2010 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 200037600.

ОАО «АМКОДОР»

220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8

ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 30 марта 2010 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 8, актовый зал Общества.

Регистрация участников собрания проводится в день и по месту проведения собрания с 13.30 до 14.45.

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Амкодор» в 2009 году.
2. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибылей и убытков за 2009 год.
4. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли, выплате дивидендов за 2009 год и направлениях использования чистой прибыли в 2010 году.
5. Об избрании членов Совета директоров, Ревизионной комиссии.
6. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
7. Об утверждении Регламента работы акционерного общества с реестром владельцев ценных бумаг.

С информацией (материалами), подлежащей представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 23 марта 2010 года в юридическом управлении Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.

УНП 100135676 **Совет директоров ОАО «Амкодор».**

АХОВА

ПАД ЗНАКАМ САВЫ

№ 2 (6)

7

23 лютага 2010 г. ЗВЯЗДА

СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

„Дысцыпліна, вытрымка, вынослівасць у самых непрадказальных сітуацыях — вось тыя асноўныя якасці, якія неабходна выпрацаваць у сабе будучаму супрацоўніку міліцыі за кароткі перыяд навучання.“

„...мы вельмі шмат увагі надаём недапушчэнню пранікнення ў міліцэйскія шэрагі асобаў з нізкімі агульнаадукацыйным узроўнем і маральна-дзелавымі якасцямі.“

Віталь КАЗЛОЎСКІ, намеснік начальніка Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, палкоўнік міліцыі:

«АД ЯКАСЦІ АДБОРУ І ВЫВУЧЭННЯ КАНДЫДАТАЎ НА СЛУЖБУ Ў ОРГАНЫ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ ЗАЛЕЖЫЦЬ АЙТАРЫТЭТ СЛУЖБЫ Ў ЦЭЛЫМ»

— Віталь Іосіфавіч, вы згодныя са сцвярджэннем, што кадры вырашаюць усё?

— Бясспрэчна. Бо ад якасці адбору кандыдатаў на службу ў немалой ступені залежыць стан дысцыпліны і законнасці ў падраздзяленнях, стан маральна-псіхалагічнага клімату ў кожным калектыве. Напрыклад, летась упраўленнем кадраў Дэпартамента аховы і кадравымі падраздзяленнямі на месцах была праведзена значная работа па выкананні патрабаванняў кіраўніка дзяржавы, кіраўніцтва МУС Беларусі па ўдасканальванні дзейнасці органаў унутраных спраў, вывучэнні і падборы кандыдатаў на службу, якасным камплектаванні і навучанні асабовага складу. Значнай падзеяй для нас стала таксама зняцце з Дэпартамента аховы ліміту колькасці, што дазволіла ўкамплектаваць падраздзяленні па меры неабходнасці дадатковымі людзьмі. Бо дэпартамент нарошчвае абароты службовай дзейнасці, тэхнічна ўдасканальваецца, расце колькасць аб'ектаў і кватэр, якія патрабуюць кваліфікаванай аховы, а значыць, расце і неабходнасць увядзення новых працоўных месцаў у падраздзяленнях.

Фота А. ЯРМАЛІНСКАЙ

— Віталь Іосіфавіч, раскажыце крыху пра «працэдуру» камплектавання падраздзяленняў аховы?

— У мэтах камплектавання пасад грамадзянамі, здольнымі па сваіх асабістых, маральных і дзелавых якасцях выконваць задачы, ускладзеныя на органы ўнутраных спраў, у мінулым годзе праводзілася мэтанакіраваная агітацыйна-растлумачальная работа ў вайсковых часцях Узброеных Сілаў, унутраных войсках МУС, установах адукацыі. Ажыццяўлялася цеснае ўзаемадзеянне з раённымі ваеннымі камісарыятамі па пытанні адбору і накіравання на службу ў органы ўнутраных спраў асобаў, звольненых з ваеннай службы ў запас. Вялася таксама актыўная работа ў сродках масавай інфармацыі і тэрытарыяльных службах занятасці.

Летась мы прынялі на службу больш як 835 чалавек.

— А як вызначаецца, ці падыходзіць той або іншы кандыдат на службу?

— Па-першае, мы вельмі шмат увагі надаём недапушчэнню пранікнення ў міліцэйскія шэрагі асобаў з нізкімі агульнаадукацыйным узроўнем і маральна-дзелавымі якасцямі. Па-другое, каб выявіць індывідуальныя здольнасці асобы, інтэлектуальнае развіццё будучых супрацоўнікаў, паспяхова выкарыстоўваецца сістэма тэсціравання і прафесійна-псіхалагічнага адбору.

— А ці шмат кандыдатаў на службу ў органы ўнутраных спраў?

— У выніку праведзеных мерапрыемстваў праз кадравыя падраздзяленні Дэпартамента аховы ў 2009 годзе прайшло больш як 4000 маладых людзей. На розных стадыях вывучэння камплектуючымі органамі было адмоўлена ў прыняцці на службу 2739 асобам па стане здароўя, у сувязі з нізкімі маральнымі і дзелавымі якасцямі.

— Якая дапамога аказваецца курсантам, якія праходзяць першапачатковую падрыхтоўку ў Вучэбным цэнтры Дэпартамента аховы?

— У падраздзяленнях дэпартамента ў 2008—2009 гг. рэалізаваная праграма па арганізацыі і правядзенні псіхалагічнай і выхаваўчай работы па ўмацаванні прафесійнай матывацыі курсантаў першапачатковай падрыхтоўкі і супрацоўнікаў са стажам службы да аднаго года. Гэта праграма дазваляе, з аднаго боку, адэкватна ацаніць кандыдату свае магчымасці да новай прафесійнай дзейнасці, а з іншага — кіраўніцтву вызначыць здольнасці кандыдата да меркаванай пасады, выявіць сапраўдныя матывы паступлення на службу, спыніць пранікненне ў ОУС злачынных элементаў.

— Віталь Іосіфавіч, вы як кіраўнік кадравага апарату Дэпартамента аховы, чым можаце ганарыцца?

— Сёння мы смела можам ганарыцца ўзроўнем прафесійнай і фізічнай падрыхтоўкі супрацоўнікаў аховы. Нядаўна супрацоўнікі дэпартамента заваявалі «золата» на чэмпіянаце МУС па лыжных гонках, мы пастаянна займаем прызавыя месцы на рэспубліканскіх, а таксама еўрапейскіх турнірах па міні-футболе, самба, лёгкай атлетыцы. У нашых падраздзяленнях служаць супрацоўнікі, якія з'яўляюцца прызёрамі Алімпійскіх гульняў і іншых значных спартыўных спаборніцтваў у сусветным маштабе. А ўвогуле, мы правамерна можам ганарыцца ўсім сваім калектывам, бо ў нас працуюць высакародныя, адданыя сваёй справе супрацоўнікі, гатовыя заўсёды прыйсці на дапамогу кожнаму грамадзяніну.

АДТОЧВАЮЧЫ ПРАФЕСІЙНАЕ МАЙСТЭРСТВА

Вучэбна-метадычны семінар па пытаннях арганізацыі ідэалагічнай работы і службовай падрыхтоўкі падраздзяленняў аховы Магілёўскай вобласці сабраў у абласным цэнтры больш як 50 супрацоўнікаў, адказных за гэтыя кірункі работы. Сход адкрыў палкоўнік міліцыі Сяргей Каралеў, які ўзначальвае аддзел ідэалагічнай работы і падрыхтоўкі кадраў Магілёўскага аблупраўлення Дэпартамента аховы. У прывітальным слове да ўдзельнікаў ён адзначыў: «Наша прафесія патрабуе мужнасці, стойкасці, вытрымкі, кемлівасці, прафесійнага майстэрства, глыбокіх ведаў і высокай культуры. Дзе б вы ні былі, заўсёды памятайце, што ахоўваеце мірную працу народа Беларусі, законы нашай дзяржавы. Сёння неабходна якасна і добрасумленна вырашаць ускладзеныя на нас задачы. Менавіта нам варта рашуча і настойліва, у адпаведнасці з законам, спыняць злачынныя з'явы і парушэнні грамадскага парадку. І ў кожным канкрэтным выпадку, у кожнай сітуацыі трэба шанаваць давер людзей, якія даверылі нам самае дарагое — сваё жыццё».

У асноўнай частцы службовае мерапрыемства было прысвечана абмену вопытам работы, сярод спрактыкаваных афіцэраў і маладых спецыялістаў. Вялікае значэнне было нададзена дыскусійнаму разгляду пытанняў, звязаных з захаваннем законнасці і дысцыпліны, пытанням планавання выхаваўчай работы ў рэгіянальных падраздзяленнях, практычным заняткам па актуальных кірунках службовай дзейнасці.

На практычных занятках лепшыя супрацоўнікі падраздзялення прадэманстравалі сваё майстэрства і веды па доглядзе і захаванні табельнай зброі, навыкі па абыходжанні з ёю.

У падагульняльнай частцы семінара ўдзельнікі наведалі гісторыка-экспазіцыйную залу Магілёўскага абласнога ўпраўлення і былі прыемна здзіўленыя тым, што экспазіцыя цалкам адноўленая. З'явіўся і новы стэнд, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і будучаму юбілею Вялікай Перамогі.

ЦЯГА ДА КУРЭННЯ?

Каля 2 гадзін ночы ад дзяжурнага Бабруйскага УУС па радыёсувязі паступіла інфармацыя пра тое, што ў кавярню «У Фёдара» праніклі невядомыя. На месца здарэння адначасова прыбылі дзве групы затрымання Бабруйскага аддзела Дэпартамента аховы ў складзе прапаршчыкаў міліцыі Андрэя Ешчыка і Андрэя Роскача, старшыны міліцыі Дзмітрыя Дарды і старшага сяржанта Аляксандра Ігумнова.

Нарады размеркаваліся: адзін прыняўся абследаваць будынак, а другі — прылеглую тэрыторыю. Падчас агляду кавярні адзін з міліцыянераў заўважыў, што невядомы спрабуе выкараскацца праз акно падсобнага памяшкання. Падазронага тут жа «сустрэлі» праваахоўнікі. У гэты ж час другой групай затрымання быў заспеты хаўруснік, які спрабаваў схавацца недалёка ад кавярні.

Пры асабістым аглядзе падазроных міліцыянеры канфіскавалі ў іх каробку з 25 блокамі цыгарэт.

Гэты крадзеж, хоць і не адбыўся, быў ужо не першым на рахунку ва ўстановы. Аднак гаспадарнікі, у мэтах эканоміі грашовых сродкаў, грэбавалі прапановамі.

РЭАЛЬНЫЯ БУДНІ АХОВЫ

Фота А. САЛЯНЮК

Міхаіл САМУСЕЎ, начальнік кадравага апарату Магілёўскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, палкоўнік міліцыі:

«ЦЯЖКІЯ БУДНІ ПАЗБАЎЛЕНЫ РАМАНТЫКІ, АЛЕ ГЭТА НЕ АДПУЖВАЕ САПРАЎДНЫХ МУЖЧЫН...»

Па выніках службовай дзейнасці Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, у 2009 годзе Магілёўскае абласное ўпраўленне выйшла ў лідары па цэлым шэрагу паказчыкаў. У тым ліку і па арганізацыі кадравай работы. Сёння мы прапануем чытачам інтэрв'ю з начальнікам кадравага апарату абласнога ўпраўлення палкоўнікам міліцыі Міхаілам Самусевым.

— Магілёўскае абласное ўпраўленне Дэпартамента аховы больш як 57 гадоў ажыццяўляе ахову аб'ектаў і памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян. Аднак, кажучы пра поспехі рэгіянальных падраздзяленняў аховы ў цэлым, не лішнім будзе ўспомніць пра тых, хто адказвае за падбор і падрыхтоўку асабовага складу да нясення няпростай службы. Вы згодныя са мной, Міхаіл Іванавіч?

— Так, менавіта ад прафесіяналізму, узроўню падрыхтоўкі асабовага складу залежыць бяспека і захаванасць маёмасці грамадзян. У Магілёўскім абласным упраўленні дэпартамента працуюць 98,4 % супрацоўнікаў ва ўзросце 25—45 гадоў, якія маюць жыццёвы вопыт і практычныя навыкі нясення службы. Разам з тым, штогод па вобласці мы набіраем 60—80 чалавек з ліку грамадзянскай моладзі для нясення службы. Для таго каб пачаць выконваць службовыя абавязкі, кандыдатам трэба прайсці першапачатковую падрыхтоўку ў вучэбным цэнтры Дэпартамента аховы, атрымаць навыкі адміністрацыйнага, крымінальнага права, прафесійнай этыкі, агнявой падрыхтоўкі, самаабароны без зброі. Дысцыпліна, вытрымка, вынослівасць у самых непрадказальных сітуацыях — вось тыя асноўныя якасці, якія неабходна выпрацаваць у сабе будучаму супрацоўніку міліцыі за кароткі перыяд навучання. Цяжкія будні пазбаўлены рамантыкі, але гэта не адпужвае хлопцаў, якія кожны год спяшаюцца ўліцца ў шэрагі нашага асабовага складу. І гэта нягледзячы на тое, што толькі 1 з 5 кандыдатаў можа прайсці ўрачэбна-медыцынскую камісію і атрымаць шанц навучацца ў вучэбным цэнтры.

— Супрацоўнікі аховы штохвілінна павінны быць гатовыя да любых нечаканасцяў?

Фота А. САЛЯНЮК

— Вы маеце рацыю, спецыфіка дзеяння нарадаў аховы шмат у чым адрозніваецца ад дзеянняў іншых супрацоўнікаў міліцыі. Калі вы калі-небудзь звярталі ўвагу, як выязджае група затрымання на «спрацаваўшы» аб'ект, то абавязкова заўважылі, што ўсе міліцыянеры знаходзяцца ў поўнай баявой гатоўнасці: у касках, бронекамізэльках, са зброяй у руках. Падстрахоўваючы адзін аднаго, яны заўсёды гатовыя выканаць сваё баявое прызначэнне — затрымаць злачынцу або правапарушальніка, які нярэдка таксама ўзброены.

— Пэўна, самаадданыя дзеянні шараговых міліцыянераў не застаюцца без увагі кіраўніцтва?

— Ініцыятыўныя супрацоўнікі, якія добрасумленна выконваюць свой службовы абавязак і імкнуцца да ўдасканалвання сваіх прафесійных навыкаў, атрымліваюць магчымасць вылучэння на вышэйшыя пасады, становяцца афіцэрамі. Мэта, вартая ўпартай работы!

Першапачаткова гэта, як правіла, пасады камандзіраў узводаў. На іх мы прызначаем толькі тых супрацоўнікаў, якія папрацавалі на пасадах малодшага начскладу, ведаюць усю спецыфіку работы, атрымалі юрыдычную адукацыю і па сваім складзе характару могуць кіраваць падначаленымі. Толькі за апошнія два гады ў нас з ліку малодшага начскладу прызначана 8 камандзіраў узводаў. Хачу адзначыць з лепшага боку работу старшых лейтэнантаў міліцыі Аляксея Ганчарова і Вячаслава Капорыкава, якія за кароткі тэрмін сталі сапраўднымі афіцэрамі і добрымі кіраўнікамі.

У сваю чаргу кіраўніцтвам упраўлення робіцца ўсё магчымае для вырашэння сацыяльна-бытавых і, галоўнае, жыллёвых праблем нашых супрацоўнікаў. У 2010 годзе здадзены ў эксплуатацыю новы жылы дом, пабудаваны з дзяржаўнай падтрымкай у выглядзе льготнага крэдытавання, у якім набудуць уласнае доўгачаканае жыллё 46 супрацоўнікаў падраздзялення аховы Магілёва. Цяпер праводзяцца арганізацыйныя мерапрыемствы па стварэнні яшчэ аднаго ЖБК на 80 кватэр.

— Наколькі інфармаванае насельніцтва аб дзейнасці вашых падраздзяленняў, і як гэта адбіваецца на камплектаванні службы?

— Большая частка насельніцтва ведае пра нашу дзейнасць не па чутках. Няправільна здалі кватэру пад ахову — і на свае вочы пераканалася, праз які перыяд часу прыбывае нарад, у якой экіпіроўцы, як рэагуе на здарэнне. Дзеянне нарадаў груп затрымання па спыненні правапарушэнняў адбываецца, як правіла, на вуліцах гарадоў, на вачах у грамадзян. Усё гэта фарміруе аўтарытэт нашых супрацоўнікаў і ў цэлым дэпартамента, і няма неабходнасці тлумачыць патэнцыйным кандыдатам на службу патрабаванні, што прад'яўляюцца да супрацоўнікаў аховы. Многія грамадзяне даведваюцца аб службе аховы, непасрэдна кантактуючы з яе прадстаўнікамі. Прычым гэта і законапаслухмяныя грамадзяне, якія звяртаюцца па дапамогу, і тыя, хто ўчыняе правапарушэнні. Акрамя гэтага, мы жывём у век рэкламы і інфармацыі. Людзі даведваюцца пра нас не толькі па матэрыялах у сродках масавай інфармацыі, але і карыстаючыся інтэрнэтам.

— Як кажуць, «не службай адзінай...». Што вы можаце сказаць наконт гэтага?

— Вялікая ўвага надаецца арганізацыі паўнавартаснага і змястоўнага баўлення вольнага часу супрацоўнікаў, стварэнню ў калектывах спрыяльнай маральна-псіхалагічнай атмасферы. Штогод праводзяцца агляды-конкурсы мастацкай самадзейнасці, народнай творчасці сярод супрацоўнікаў і членаў іх сем'яў, спартыўныя мерапрыемствы.

Супрацоўнікі падраздзялення аховы Магілёўшчыны дабіліся высокіх вынікаў у спорце — гэта майстры спорту Алег Гутнік, Сяргей Лось, Дзмітрый Сіваў, Аляксандр Басарыя, Руслан Шалаеў і Аляксей Кашаедаў.

Не забытыя ў падраздзяленнях аховы службовыя і баявыя традыцыі, на якіх выхаваны ўжо некалькі пакаленняў супрацоўнікаў. Багаты жыццёвы вопыт ветэранаў Магілёўшчыны запатрабаваны ў выхаваўчай рабоце. Па праве старэйшых таварышаў яны выступаюць сёння ў ролі настаўнікаў і шэфаў. Гэта Васіль Прохаравіч Яшкоў — былы начальнік абласнога ўпраўлення, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, Аляксандр Іванавіч Дзяткоў — старшыня Савета ветэранаў абласнога ўпраўлення і іншыя.

Шматлікі калектыў падраздзялення аховы Магілёўшчыны з годнасцю выконвае свой службовы абавязак, пакалькі людзі, якія працуюць у ім, — сапраўдныя прафесіяналы, гатовыя выканаць усе пастаўленыя перад імі задачы.

Службовы прафесіяналізм, высокі ўзровень фізічнай падрыхтоўкі, актыўная жыццёвая і грамадзянская пазіцыя — вось збіральны вобраз сучаснага супрацоўніка. А шматлікія ўзнагароды і прызавыя месцы на чэмпіянатах Дэпартамента аховы і на рознага роду конкурсах гавораць самі за сябе. Бо, як адзначае Міхаіл Самусеў, гэтыя людзі даказваюць, што «Ахова» — не проста гучнае слова, а прызванне, карпатлівая штодзённая праца, паколькі прафесіяналізм складаецца з многіх асабістых якасцяў, якім часта нідзе нельга навучыць.

ВЕДАЙ НАШЫХ

У першай палове лютага ў Віцебску прайшоў чэмпіянат Дэпартамента аховы МУС Беларусі па рукапашным баі. У спаборніцтвах узялі ўдзел 49 удзельнікаў з сямі зборных камандаў усіх абласных і Мінскага гарадскога ўпраўлення дэпартамента. Выдатна, што сёлета, акрамя вопытных спартсменаў, а гэта шэсць майстроў спорту па рукапашным баі, у турніры ўдзельнічалі маладыя супрацоўнікі. Хлопцы выступалі ўпершыню, аднак паказалі дастаткова высокія вынікі. Да слова, усе прадстаўнікі гэтага віду спорту — дзейныя супрацоўнікі страявых падраздзяленняў аховы.

У розных вагавых катэгорыях месцы размеркаваліся наступным чынам: у вагавой катэгорыі 65 кг «золата» выйграў прадстаўнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення Сямён Тырля, ён жа атрымаў прыз «За лепшую тэхніку»; у вагавой катэгорыі 70 кг першае месца заняў Аляксандр Апаневіч — прадстаўнік Віцебскага абласнога ўпраўлення; лепшым у вагавой катэгорыі 75 кг стаў Артур Баярчук — супрацоўнік Мінскага гарадскога ўпраўлення. Цікавым і захапляльным стаў паядынак паміж брастаўчанінам Анатолем Сафановічам, майстрам спорту па каратэ, і віцябчанінам Аляксандрам Свіціным, майстрам спорту міжнароднага класа па кікбоксінгу (85 кг). Ва ўпартай, практычна роўнай барацьбе, перамогу ўсе ж атрымаў Сафановіч.

У агульным камандным заліку залатым прызёрам стала каманда Віцебскага, сярэбраным — каманда Брэсцкага, а бронзавым — Гродзенскага абласных упраўленняў.

Фота Н. ЛЕРНАТОВІЧ

Каманда пераможцаў са сваімі кіраўнікамі.

«БАРАБАШКА» З КЛЮЧАМІ АД КВАТЭРЫ

Міліцыянер-кінолаг Дзяніс ТАРАСЕВІЧ і міліцыянер-вадзіцель Ігар САЦЭВІЧ.

Калі ў няпоўнагадовага сына жыхаркі г. Высокае Камянецкага раёна ў перыяд навагодніх святаў зніклі ключы ад дома, яна і ўявіць не магла, што гэта непрыемнасць пакладзе пачатак сістэматычнаму знікненню каштоўных рэчаў з кватэры. Спачатку прапажы не насілі сур'ёзнага характару. Жартуючы, гаспадыня кватэры нават спісвала ўсю віну на «барабашку», але больш дакарала сябе за няўважлівасць.

Неяк, адпраўляючыся на працу, жанчыне не давала спакою прадчуванне: штосьці абавязкова здарыцца. Яна ўсё ж адправілася на службу, аднак выседзець да канца працоўнага дня так і не змагла. Падымаючыся па лесвіцы свайго пад'езда, змучаная ўсялякімі непрыемнымі думкамі, яна ўбачыла, як невядомы падлетак зачыняе дзверы яе кватэры.

Нарад групы затрымання Камянецкага аддзела аховы ў складзе міліцыянера-кінолага прапаршчыка Дзяніса Тарасевіча і міліцыянера-вадзіцеля сяржанта Ігара Сацэвіча ў гэты момант высвятляў абставіны выкрадання аўтамагнітолы з машыны ў суседнім дварэ. Тут да іх падбег мужчына і паведаміў, што ў адным з дамоў прама цяпер учыняецца крадзеж.

Затрымаць васьмікласніка добра падрыхтаваным мужчынам не склала асаблівай цяжкасці. Карыстаючыся раней выкрадзеным ключом, зладзюжка без цяжкасці пранік у «шматпакутную» кватэру. У гэты раз ён «прыбраў да рук» 1475 долараў ЗША, 1300 еўра, парфуму і спіртныя напоі.

НАД СПЕЦВЫПУСКАМ ПРАЦАВАЛІ:
Уладзімір ЗДАНОВІЧ,
Аляксандр ГЕРАСІМАЎ,
Юлія АКСЮЧЫЦ,
Алена ЯРМАЛІНСКАЯ,
Аксана САЛЯНЮК,
Яўген КУЛЯГІН,
Вольга КІПЧАНКА.

АДЗІН ДЗЕНЬ ГРУПЫ ЗАТРЫМАННЯ

Са жніўня па снежань 2009 года Дэпартамент аховы сярод сваіх абласных і раённых падраздзяленняў правёў акцыю «Даражу службай у ахове» на лепшую публікацыю, тэле- і радыёсюжэт у сродках масавай інфармацыі. Супрацоўнікі паставіліся да гэтага з усёй адказнасцю. На працягу пяці месяцаў на конкурс прыйшло некалькі соцень матэрыялаў.

Адным з тых, што перамаглі, стаў артыкул, напісаны міліцыянерам групы затрымання Магілёўскага абласнога ўпраўлення, сумесна з журналістам адной з раённых газет.

Будні міліцыянераў Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь непрадказальныя. Знаходзячыся пастаянна напагатове, яны гатовыя прыбыць да месца спрацоўвання трывожнай сігналізацыі ў лічаныя хвіліны. І што чакае іх у, здавалася б, самы звычайны працоўны дзень, невядома. Нават ім самім. Пра адзін дзень свайго дзяжурства расказаў Сяргей Рудзянкоў, міліцыянер групы затрымання Касцюковіцкага аддзялення аховы.

7.00. Пачынаецца працоўны дзень. Перш-наперш прыехалі ў РАУС, каб атрымаць табельную зброю для заступлення на службу. Давядзенне аператыўнага становішча ў горадзе за бягучыя суткі ў аддзеле ўнутраных спраў — працэдура традыцыйная. Прычым не толькі з намі, але і з іншымі службамі. Раз'язджаемся кожны па сваіх месцах. Наша група едзе ў аддзяленне аховы, дзе з намі праводзіць інструктаж адказны ў гэты дзень афіцэр. Хто ведае, можа, менавіта ў гэты дзень з намі адбудзецца менавіта такая сітуацыя? Кожнае дзяжурства непрадказальнае...

8.00. Прыступілі да нясення службы. Працуем строга па графіку, які распісаны па хвілінах. Маршрут руху пралягае толькі ў межах горада. За межы Касцюковічаў мы не маем права выехаць. Чаму? Уся сутнасць у тым, што зона дыслакацыі разлічаная такім чынам, каб у выпадку спрацоўвання кнопкі трывожнай сігналізацыі мы змаглі прыбыць да месца ў самы кароткі тэрмін. Бо нарматыўна-прававымі актамі вызначаныя часовыя рамкі прыбыцця. Максімум — 7 хвілін. Але мы звычайна спраўляемся раней.

8.20. Пачынаем патруляванне. Усё ціха. Нічога і ніхто не прыцягвае нашай увагі.

13.00. Знаходзімся на вуліцы Камсамольскай. Па рацыі паступае першае паведамленне. Дзяжурная пульта кіравання дакладвае аб спрацоўванні трывожнай кнопкі ў краме № 11. Людзі яе называюць «шкляной». Спыніліся каля міні-рынку на Моладзевым. Трэба аператыўна эвакуіравацца: бронекамізэлька, шлем. На гэту «працэдуру» звычайна ідзе секундаў 20. Без гэтага ніяк, трэба засцерагчы сябе. Прыбылі хутка, балазе, знаходзіліся недалёка.

Бягу і думаю, трывожную кнопку, як правіла, проста так не націскаюць. Альбо штосьці ўкралі, альбо хтосьці распачаў бойку. Страхуем адзін аднаго. Усялякае можа быць. На гэты раз усё тыпова: падазроны, людзі, якія сабраліся вакол яго. Мы нікога не выпускаем з крамы, каб зламыснік не ўцёк. Прадавец паказвае на мужчыну, на выгляд прыстойна апранутага, з вялікай сумкай у руках. Далей усё як звычайна: апытанне сведак, устанаўленне асобы падазронага. Бываюць і такія, якія не заўсёды пагаджаюцца з абвінавачаннем, наладжваюць скандалы на публіку. Гэты «зламаўся» хутка, прызнаў сваю віну. Па-іншаму і быць не можа, доказы відавочныя: з яго сумкі прадавец дастала пакет малака і мясную прадукцыю на суму каля 35 тысяч рублёў. Наша місія ў гэтай справе заканчваецца. Саджуся ў машыну, званю дзяжурнаму пульта кіравання. Цікаўлюся часам прыбыцця да аб'екта, на якім спрацавала кнопка. На гэты раз 1 хвіліна 50 секундаў. Добры вынік!

13.35. Ці будзе сёння яшчэ «спрацоўванне», невядома. Наша задача — заўсёды быць напагатове. Ад РАУС вярнуліся на свой маршрут. Дзень сёння будні, у горадзе ціха. У выхадныя сітуацыя можа карэнным чынам памяняцца, асабліва вечарам, калі моладзь выходзіць адпачыць.

18.00. Нас выклікае па радыёстанцыі дзяжурны РАУС, просіць праехаць да гастранома № 1, каля кавярні «Чайка»:

— Бойка. Акажыце дапамогу патрульна-паставому нараду.

— Вас зразумеў. Выязджаем... — паведамляю па рацыі.

Едзем да месца бойкі. Зноў хтосьці штосьці не падзяліў. У натоўпе заўважаем патруль, які спрабуе ўціхамірыць добра падпіўшых мужчын. Парушальнікаў спакою — чатыры. Убачыўшы нас пры поўнай экіпіроўцы, яны рэзка сціхарыліся. Часта так бывае — калі людзі бачаць нас у бронекамізэльках і са зброяй у руках — палохаюцца. А тым часам прыехаў на дапамогу і экіпаж ДАІ. Аднаго з парушальнікаў парадку нам давялося затрымаць.

19.00. Да канца нашай змены надвор'е пагоршылася. Насоўваліся навальнічныя хмары. З практыкі ведаю, калі пачынаецца навальніца, работа напарадзе напружаная. Як правіла, з-за навальніцы можа быць пашкоджана ахоўная сігналізацыя на некалькіх аб'ектах. Так яно і атрымалася. Але, хачу адзначыць, нават пры адключэнні электрычнасці наша ахоўная сігналізацыі «сілкуецца» ад рэзервовых крыніц сілкавання.

У гэты вечар за паўгадзіны спрацавалі чатыры аб'екты. Па вялікім рахунку, дробязь. Бывае і больш. Аднойчы, памятаю, пры штармавым ветры спрацавала 20 аб'ектаў! Тады ўжо дакладна давялося «папацець»... Быў падняты ўвесь асабовы склад па трывозе, і на працягу 30 хвілін усе аб'екты былі забяспечаны аховай. У такіх выпадках часам даводзіцца прасіць дапамогі ў РАУС, але сёння справімся самастойна. Добра, што аб'екты спрацавалі не ў адзін час, таму да кожнага з іх паспелі ў самыя кароткія тэрміны. На апошні прыбылі за 4 хвіліны. Выдатна...

20.00. Нас мяняе іншы нарад. Пытанні наконт дзяжурства, здача змены адказнаму, даклад аб падзеях за дзень. Едзем у РАУС, здаём зброю. Змена закончылася. Стаміўся. Дзень выдаўся напружаным. У наступны раз заступаю ў ноч. Іду адсыпацца...

Галоўны беларус Літвы Хведар НЮНЬКА:

«ДА ТРЫНАЦЦАЦІ ГАДОЎ Я ВЕДАЎ ТОЛЬКІ ПОЛЬСКУЮ МОВУ, А ВЫРАС БЕЛАРУСАМ...»

Глеб ЛАБАДЗЕНКА

КАЛІ я даведаўся, колькі цяпер гадоў Хведару Нюньку, то ахнуў — 81!.. Назіраўшы за ім на розных беларускіх імпрэзах у Вільні, заўжды захапляўся ягонай энергіяй, энергетыкай, актыўнасцю і — нязломнай, невынішчальнай беларускасцю. Ад 1989 года, ад моманту ўтварэння, Хведар Нюнька ўзначальвае Таварыства беларускай культуры ў Вільні. І калі вы пабачыце ў сённяшняй літоўскай сталіцы мемарыяльныя дошкі на беларускай мове — Кастусю Каліноўскаму, Рыгору Шырму, Янку Купалу — ведайце: гэта справы Таварыства і асабістая заслуга Хведара Нюнькі. Але сустрэўшыся з ім учора ў Вільні за кубачкам зялёнае гарбаты, мне захацелася пагутарыць найперш не пра клопат надзённы, а распытаць пра яго самога, пра яго пакручасты лёс... Маці не хацела, каб Хведар нараджаўся зусім — піла розныя пігулкі і гадасці: час быў цяжкі, а адно дзіця ў сям'і ўжо было. Але Хведар выжыў — хоць і нарадзіўся хваравітым. Адбылося тое ў вёсцы пад Мастамі, жыў з бацькамі ў Мастах і Шчучыне, адтуль сям'я ў 1943 годзе перабралася ў Вільню. Нюнька памятае апошніх уладароў нашых палацаў, норавы і дэталі даваеннага жыцця беларускіх мястэчак. Вось пра што захацелася мне папытаць Хведара Нюньку.

«Якуб ужо як пан, жалезныя ложкі мае!..»

— Што вы запомнілі з тае, перадваеннае Беларусі?

— Мае бацькі пераехалі з вёскі Алешавічы, што ў Мастоўскім раёне, калі мне было ўсяго некалькі месяцаў. Спачатку ў Масты. Вёска была даволі бедная, там былі напалову католікі, напалову праваслаўныя. Беларусы, але нацыянальна несвядомыя. Зямлі ў нас было мала — усяго 2,5 гектара. А сям'я ў дзеда была вялікая... Таму трэба было думаць, як пражыць далей. Масты тады толькі пачалі разбудоўвацца, там быў такі пан Канапацкі, які заснаваў фанерную фабрыку, гэтая фанера ішла нават на будаўніцтва самалётаў! Гэты пан даваў бясплатна зямлю тым, хто прыяджаў туды працаваць да яго.

— А сёння ваша вёска яшчэ існуе?

— Так. Старыя людзі ўжо павыміралі, а моладзі троху ёсць. Я быў там гады два таму, праехаў праз усю вёску, на жаль, нікога знаёмага не пабачыў. Там кіламетры за два да могілкаў мая радня пахаваная — дзед, баба... Суседзі таксама, якіх я добра ведаў — бо да 12—13 гадоў бываў там у дзеда з бабаю...

— А па пераездзе ў Масты чым займаўся ваш бацька?

— Бацьку падказалі, што там можна адчыніць сваю краму, бо разбудоўваецца фабрыка — будуць пакупнікі. І ён ухапіўся за гэтую ідэю. Прадалі з мамаю пасаг — каня, карову... Усё адно было мала. Дык бацька пазычыў у «амерыканца». «Амерыканцамі» называлі тых...

—...хто ездзіў на заробкі?

— Так! У аднаго такога чалавека бацька пазычыў 100 долараў.

— У долярах?!

— Ну так! У Мастах тады, праўда, памяняць не было дзе, трэба было ехаць у Гародню ці Ліду. Як і па тавар — ехалі канём. Да Ліды 55 кіламетраў, да Гародні — 62, амаль тое самае. Вазілі спецыяльныя балаголы. Вось уначы бацька едзе ў Ліду, забірае тавар, на другі дзень прывозіць. Бацька быў чалавек слоўны, акуратны што да сваіх абавязкаў. І нават калі часам браў тавар у крэдыт — заўжды аддаваў дзень у дзень, таму яму верылі. Перад вайной, годзе ў 1938-39, ён ужо браў тавары з самае Варшавы, бо там былі самыя нізкія кошты.

— Няўжо таксама канём?!

— Не, ужо цягніком — у Мастах жа станцыя была.

— Дык ваш бацька нейкую краму адчыніў, так?

— Ну так. Пан Канапацкі даў пляцоўку. Бацька дамовіўся з панам на лес — мужыкі талакою дапамаглі яму зрубіць хату, на санях перавезлі, паставілі. У адной частцы — памяшканне пад краму, у другой — нашае жытло. Я той дом ужо добра памятаю. Хата мокрая была, напачатку на бэльках вільгаць нават замярзала ўзімку. Але крама была! Прывёз першыя тавары, пакупнікі пайшлі, абарот пачаўся. Бацька быў вельмі эканомны. Не дазваляў сабе браць што лепшае паесці з крамы — а браў, што не прадавалася. А ўжо жонка, мая маці, якраз дзецям брала што выгаднейшае. Бо ў той краме ў адным куце прадавалася сукно ўсякае, а ў другім прадукты.

— Універмаг!

— Атрымліваецца!..

— А бацька сам гандляваў?

— Ну так. Потым ужо маці памагала. Тады ўжо двое дзяцей было — сястра мая старэйшая і я. Я і цяпер памятаю, як у краму прывозілі бочкамі селядцы, прыходзілі мужыкі і выбіралі таўсцейшыя. Але, даядаючы за рабочымі, бацька затое ў хуткім часе разлічыўся з тым «амерыканцам», і пайшоў прыбытак! У нас у хаце з'явіліся жалезныя ложкі. А гэта ўжо была вялікая справа, бо ўва ўсіх былі драўляныя — і там клапоў было бязлік!.. І мужыкі ўжо ў вёсцы казалі: «Ты глянь — Якуб ужо як пан, жалезныя ложкі мае!..» А потым бацька купіў сабе мапед «Закс» — і ўжо ў Ліду і Гародню стаў ездзіць на тым мапедзе! Прыязджаў у вёску, браў бутэльку гарэлкі, частаваў мужыкоў. Дык мужыкі ўвогуле пачалі кумекаць: «Слухай ты, Нюнька такі як мы быў, а цяпер во як, на матацыкле ездзіць!.. Трэба і нам паспрабаваць крамы адчыніць». І некаторыя спрабавалі — і прагаралі... Бо трэба было нюх мець, і быць беражлівым, як мой бацька — і часам з'есці не тое, што ты хочаш, а што застаецца. У 1935 годзе, памятаю, па радыё гаварылі, калі памёр Пілсудскі. У нас ужо прыёмнік быў. Складаны апарат быў — трэба было закопваць вядро ў зямлю, як зазямленне, антэну вялікую рабіць на дах. Электрычнасці ж не было, дык мелі такі акумулятар з дзіркамі — уторкнеш у адну дзірку, пасля ў іншую — і так пакуль той акумулятар не выйдзе ўвесь. Была ў бацькі слабасць — як Першамай ці якое іншае свята, ён уключаў той прыёмнік як мага гучней — каб усе нават на вуліцы чулі. І лавіў савецкае радыё — песні, святканні. Казаў: «Во як жывуць людзі!..» Бо ў польскіх газетах пісалі, што за кардонам голад, рэпрэсіі.. А ён казаў: «Ці ж можа быць, каб голад быў — а людзі так весяляцца і спяваюць?!» Прапаганда — моцная рэч... І бацька таму меў славу «пракамуністычнага». Рабочыя данеслі фабрыканту, што Нюнька агітуе... Пасля яшчэ была гісторыя, што адзін фабрыкант, Ян Дэмбоўскі, краў грошы з касы фабрыкі. І на тыя грошы купляў багата чаго ў майго бацькі. Гэта раскрылася. І хоць бацька не быў вінаваты, фабрыкант вырашыў адпомсціць «пракамуністычнаму» — і выставіў ахову, якая не давала працаўнікам хадзіць у краму Нюнькі. Гандлю ў Мастах прыйшоў канец... Бацька вырашыў перабрацца ў Шчучын. Гэта быў хіба трыццаць шосты год.

«Бацька белае выкінуў, а чырвонае вывесіў над крамаю...»

— У Шчучыне таксама краму адчынілі?

— Так, толькі не будавалі, а наймалі памяшканне — у такіх сабе гандлёвых радах. Жылі таксама ў найманай кватэры — адной, другой, трэцяй. Справы пайшлі вельмі паспяхова. Тавары стаў браць на фабрыках — у Беластоку, Варшаве, Лодзі. Наладзіў-такі сабе аптовы гандаль — сшыткі прадаваў у школы цэлымі партыямі, са зніжкай. Усім было выгадна!

— Дык вы ў школу ўжо ў Шчучыне пайшлі?

— Так — 1 верасня 1939 года! Па радыё ў той дзень абвясцілі, што пачалася вайна. Настаўніца сказала: ідзіце дахаты, як немца паб'ем, тады будуць заняткі... Школа польская была, усе тады школы польскія былі...

— А ўвогуле на якой мове тады размаўлялі?

— Мяне бацькі хацелі выхаваць так, каб я мог зрабіць сабе кар'еру ў Польшчы — таму я да 13 гадоў ведаў толькі польскую мову, са мной па-іншаму не размаўлялі. Хлопцы ў вёсцы размаўлялі па-беларуску, а я з імі па-польску... Бацька настроіў радыё на Мінск — і ведаў, што бальшавікі рыхтуюцца ўвайсці. І вось мы з бацькам пайшлі сустракаць першыя танкі. Ён з іншымі крамнікамі, яўрэямі, перад тым дамовіўся, што ўсе разам пойдзем сустракаць. А як трэба было ісці, дык ніхто не пайшоў — толькі бацька і я пры ім. Зайшлі ў горад два танкі — і бацька мой абняў, расцалаваў таго камісара. Палякі толькі коса паглядалі... І яны на ўсё жыццё гэта запомнілі. Потым такі як мітынг зрабілі — і гэты камісар прызначае бацьку кіраўніком горада, як мэрам усё адно. Але бацька распытаў падрабязней — і адмовіўся. Бо ў яго ж крама, трэба было гандляваць... Пайшоў у краму, вынес сцяг, — белае адарваў, а чырвонае вывесіў каля ўваходу. І за сем дзён распрадаў вайскоўцам, радасны, усю краму. Не ведаючы яшчэ, што тыя савецкія рублі нічога асаблівага не вартыя...

— Цікава атрымліваецца: бацька вас выхоўваў па-польску з прыцэлам на польскую кар'еру — а сам быў савецка арыентаваным чалавекам...

— Я б не сказаў, што савецка арыентаваным. Ён яшчэ ў 1914 годзе, калі пачалася Першая сусветная, быў бежанцам — уцякаў з іншымі ажно да Урала. І да іх там людзі вельмі добра паставіліся, прынялі, прытулілі. Тая памяць нагадвала яму, што людзі з усходу — добрыя...

«Я размаўляў па-нямецку — і гэтым уратаваў бацьку ад расстрэлу»

— Як вы патрапілі ў Вільню?

— Калі пачалася вайна, я быў у Алешавічах у дзеда — пабачыў, як пачалося, усё стала рвацца. Салдаты прыйшлі ў вёску і сказалі: «Уцякайце ў лес, мы там будзем у маёнтку Незабытоўскіх падпальваць склад са снарадамі, дык каб нікога не забіла». Я вярнуўся ў Шчучын да бацькоў. Стала цяжка, арганізавалася нямецкая камендатура. Бацькі нанялі мне настаўніка — каб я вучыў нямецкую мову, якую я цудоўна засвоіў. Праз пэўны час нехта данёс немцам пра «левую» арыентацыю майго бацькі — яго завялі ў камендатуру, ледзьве не расстралялі. Я прыбег і па-нямецку патлумачыў, што бацька падраў сцяг. І гэта ўратавала — бо немцы не любілі палякаў. Давялося ўцякаць. І тады па пэўных прычынах пераехаць у Вільню было прасцей, чым у Гародню... У Вільні было шмат пустых кватэраў — бо немцы мэтанакіравана вынішчалі яўрэяў, пусцелі цэлыя дамы...

— Што вы рабілі пасля вайны?

— Беларускіх школ не было, я паступіў у рускую гімназію імя Чарняхоўскага — яна знаходзілася там, дзе цяпер Дом Урада. Скончыў яе ў 1948 годзе, паступіў на лясны факультэт пры ўніверсітэце — але цераз год яго далучылі да сельскагаспадарчае акадэміі ў Коўне. Купіў сабе матацыкл ІЖ-350 — і на ім ездзіў у Вільню... У 1953 годзе я паспяхова здаў экзамены, абараніў дыплом па спецыяльнасці «інжынер лясной гаспадаркі». Атрымаў накіраванне ў Дзяржплан. Гэта была адказная ўстанова, якая давала шанцы на кар'еру! Але ўладкаваўся ў іншае месца, гады тры працаваў па спецыяльнасці інжынерам — аднак было не вельмі цікава... Перайшоў працаваць у праектныя будаўнічыя інстытуты, адпрацаваў трыццаць пяць гадоў галоўным спецыялістам па каштарысах. Меў вялікія заробкі — тысячу рублёў, у той час як праезд у транспарце каштаваў 4 капейкі, свініна была 2 рублі. Ужо тады расчараваўся ў камуністах. І калі ў Шчучыне я быў першым піянерам, то ў Вільні, дазнаўшыся больш, я стаў антыкамуністам...

...Ведаеце, я не стаў распытваць Хведара Нюньку менавіта пра ягоную дзейнасць на пасадзе старшыні Таварыства беларускай культуры ў Вільні, якое ён з аднадумцамі стварыў 4 лютага 1989 года. На гэтае пытанне я магу адказаць і сам. З тузін мемарыяльных дошак па ўсёй Вільні — Францішку Скарыну, Янку Купалу, Браніславу Тарашкевічу, Пётру Сергіевічу, Рыгору Шырму, Кастусю Каліноўскаму, Вацлаву Ластоўскаму, Наталлі Арсеневай, Максіму Гарэцкаму... А таксама — дзясяткі выдадзеных кніг, дзясяткі праведзеных імпрэзаў, штодзённая праца на ніве Беларушчыны. Зусім нядаўна гарадская ўправа Вільні ўзнагародзіла Хведара Нюньку дыпломам «За заслугі перад Вільняй». Аднаго з прадстаўнікоў усіх дыяспар.

Хведар Нюнька любіць паўтараць, што ў Вільні мусіць побываць кожны беларус. І ён зрабіў шмат, каб мы маглі пабачыць беларускую Вільню.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

КЛАСІФІКАЦЫЙНЫЯ КОНКУРСЫ

Яны (аўтарскія-9 і 10) — з нормай першага спартыўнага разраду па шашках — міжнародных і рускіх. У першым з іх заданні належаць міжнароднаму гросмайстру Уладзіміру Матусу (Масква), у другім — майстру ФМЖД Віктару Шульге (Мінск). Падаём чарговыя з іх:



№ 9/10. **Белыя:** 20, 24, 29, 31, 34, 39, 46, 48 (8). **Чорныя:** 11, 12, 21, 26, 28, 37, 42, 43 (8). Выйгрыш.



№ 10/5. **Белыя:** e1, e7, дамка a5 (3). **Чорныя:** d8, e3, e5, f6, g5 (5). Перамога белых.

Дарэчы, Уладзімір Матус узначальвае Камісію па кампазіцыі Міжнароднай федэрацыі шашак (ФМЖД), а Віктар Шульга з'яўляецца яе членам.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

МІНІ-ПАРТЫІ

Вазьміце на заметку яшчэ адну з іх. Яна таксама з калекцыі майстра Анатоля Рогача з Вілейкі: 1. cb4 fe5 2. gh4 ef4 3. e:g5 h:f4 4. bc3 bc5 5. ab2. Дрэнны ход, які фактычна прайграе партыю: 5. ...ab6 6. ba5 de5! Чорныя паставілі пастку, у якую белыя і трапілі: 7. cb4? ef6! 8. b:d6 fg5 9. h:d4 c:a1x. Партыя гулялася ў 2-м жаночым першынстве Беларусі па перапісцы 1991 года паміж Валянцінай Сенчанка з Віцебска і школьніцай з Вілейкі Людмілай Рогач (чорныя). Цікава, што тады Людміла заваявала залаты медаль, апярэдзіўшы некалькі майстроў спорту, у тым ліку і неаднаразовую чэмпіёнку СССР па гульні на дошцы Алену Соркіну.

Як паведаміў карэспандэнт нашай рубрыкі Мікалай Саўкін (п/а Суднікі Валожынскага раёна), ён заняў сёмае месца (пры 20-ці ўдзельніках) у адкрытым завочным першынстве Мінскай вобласці. Прызёрамі ж сталі І. Працук (Пастравы), А. Рогач і барысаўчанін П. Аляхно.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

Аўтарскі-9 (У. Матус): **№ 6** — 42, 41, 3, 3:39:8, 30, 34x; **№ 7** — 2 (44A) 9, 31, 32, 23, 28x. A(18) 8, 31 і г. д.

Аўтарскі-10 (В. Шульга): **№ 1** — b8, c7, a5, g3, c5, a3x; **№ 2** — f8, e3, b8, g3x.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.12	17.34	10.22
Віцебск —	7.04	17.21	10.17
Магілёў —	7.02	17.24	10.22
Гомель —	6.56	17.24	10.28
Гродна —	7.27	17.50	10.23
Брэст —	7.24	17.53	10.29

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Імяніны

Пр. *Васіля, Генадзя, Інакенція, Маркела, Нікіфара, Панкрата.*

К. *Ізабэлы, Малгажаты, Марты, Нікіфара, Пятра.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.





Дзве даты

23 лютага

1275 год — нарадзіўся Гедымін, вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага. Пачатак кіравання Гедыміна супаў з утварэннем у ВКЛ самастойнай Літоўскай праваслаўнай мітраполіі і спробай нармалізаваць адносіны з каталіцкім Захадам. З 1323 года ў шэрагу пасланняў Гедымін называў сябе «каралём Літвы і Русі, уладаром і князем Жмудзі», выказваў намер прыняць каталіцкае хрышчэнне. Ён актыўна запрашаў у княства манахаў, майстроў розных спецыяльнасцяў, гарантаваў ім ільготы. Ад пераходу ў каталіцызм адмовіўся, задаволіўшыся ў 1324 годзе мірам з Тэўтонскім ордэнам. За час кіравання Гедыміна ВКЛ пераўтварылася ў моцную ўсходне-еўрапейскую дзяржаву, тэрыторыя якой павялічылася ўдвая. Памёр вялікі князь у 1341 годзе.

1954 год — Пленум ЦК КПСС прыняў рашэнне аб асваенні цалінных і залежных земляў.

Цытата дня:

«Велічыня рэкламнай шуміхі вакол тавара адваротна прапарцыянальная яго кошту і якасці».

Артур Блох (нар. 1948), амерыканскі пісьменнік.

ПРЫСУТНАСЦЬ СЯМЁРКІ Ў ПРАВАСЛАЎНЫМ КАЛЕНДАРЫ

Не падлягае сумненню, што менавіта сямёрка, якая была асноўнай у нумаралогіі Новага запавету, аказалася структурафарміравальнай асновай хрысціянскага, а пазней праваслаўна-візантыйскага календара, які трапіў на землі Старажытнай Русі разам з яе хрышчэннем, а пазней моцна паўплываў на рэфармаванне традыцыйнага календара ўсходнеславянскіх народаў. У выніку сярод рускіх, беларусаў і ўкраінцаў утварыўся своеасаблівы каляндар — сімбіёз, у якім адначасова сталі суіснаваць дзве сістэмы ўяўленняў аб Сусвеце. Веснавы цыкл традыцыйнага (язычніцка-ведыйскага ў аснове сваёй) календара беларусаў вымушаны быў падпарадкоўвацца хрысціянскай Пасхаліі, якая сёння і вызначае структуру народна-праваслаўнага календара.

● Пасхальны цыкл ахоплівае даволі вялікі адрэзак часу, які дзеліцца на дзве роўныя часткі: перадвелікодную і паслявелікодную, якія ў народнай традыцыі доўжацца па семдзесят дзён, а ў царкоўна-кананічнай — па сем тыдняў. Час перад Вялікаднем займае Вялікі сямітыднёвы пост , а праз сем тыдняў пасля яго святкуецца Тройца. За сем дзён да Вялікадня адзначаецца Вербніца, а Велікодныя святы доўжацца цэлы тыдзень (або, на царкоўна-славянскай мове, сядміцу).

● Здарылася так, што шэраг святаў праваслаўнага календара, звязаных з жыццём Ісуса Хрыста, Багародзіцы і Іаанам Хрысціцелем, які першым прадказаў прыход Збавіцеля, адзначаюцца якраз сёмага дня розных месяцаў: Раство Хрыстова — 7 студзеня, Дабравешчанне — 7 красавіка, дзень нараджэння Яна — 7 ліпеня (7.07.).

● Лік сем — гэта «сінонім року, лёсу, уздзеяння на чалавека высокіх, як правіла, варожых або нейтральных да яго сілаў... Сем — гэта барацьба з незразумелай небяспекай, вайна з пераўзыходзячым па сіле праціўнікам і непазбежны выбар паміж перамогай і пагібеллю пры адсутнасці прамежкавых варыянтаў».

● Гэтыя меркаванні цалкам стасуюцца з традыцыйнымі ўяўленнямі нашых продкаў аб стыхіі ўзгаданых сямёрак. Беларусы лічаць, што дні 7.01, 7.04, 7.07 — вельмі нешчаслівыя для нараджэння дзяцей. Асабліва не пашанцуе дзяўчыне, якая народзіцца на Дабравешчанне («што ні крок, то бяда»). Адначасова на працягу ўсяго цыкла земляробчых работ забаранялася распачынаць адказныя справы ў той дзень тыдня, у які ў гэтым годзе было Дабравешчанне.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Нядаўна зразумеў, чаму ўсё ж даволі ўзроставы Б'ёрндален так імчыцца па трасе, а яго дагнаць ніхто не можа... Ён ззаду сябе ўсё пяском пасыпае!

☺

Мужык заходзіць у рыбалоўную краму і звяртаецца да маладзенькай прадаўшчыцы:

— Дзяўчына, у вас прынада сіліконавая?

— Мужчына! У мяне ўсё натуральнае!

☺

Не-е-е... Лепш бы я нарадзілася хлопцам.

Вось адчыніла дзверцы шафы, і што выпала, тое і надзела б!..

— Новенькая?

Віншую з днём нараджэння **Валюшу ШПЭТ** з Барысава. Шчасця табе, мілая, дабрабыту, здароўя, узаемаразумення ў сям'і.

Анатоль.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



36,6°

ПАВЯРНУЛА СОНЦА НА ВЯСНУ: ЧАС ПАДМАЦАВАЦЦА ВІТАМІНАМІ

Пасля працяглай зімы наш арганізм стаміўся. Прычына — шэраг неспрыяльных фактараў: мароз, моцны вецер, недахоп сонечнага святла і вітамінаў. Апошняе — надзвычай важная акалічнасць для праграмы веснавога аднаўлення чалавека, змучанага зімовым авітамінозам. Роля вітамінаў у нашым жыцці велізарная. Яны неабходныя для росту і аднаўлення клетак і тканак, уплываюць не толькі на самаадчуванне, але і надаюць чалавеку прывабны выгляд: бліскучыя і пушыстыя валасы, здаровы колер твару, маладжавасць.

Сам па сабе чалавечы арганізм не здольны вырабляць вітаміны і павінен атрымліваць іх у гатовым выглядзе ў форме прэпаратаў або правітамінаў, якія змяшчаюцца ў раслінах ці жывёльнай ежы.

Зараз вядома некалькі дзясяткаў вітамінаў, кожны з якіх выконвае сваю ролю ў падтрыманні жыццёва важных функцый арганізма.

Вітамін А (рэцінол) і яго **правітамін (карацін)** спрыяльна ўплываюць на рэгенерацыю клетак скуры, узмацняюць супрацьінфекцыйныя арганізма ўсякага кшталту інфекцыям. Недахоп вітаміну А з'яўляецца прычынай сухасці і арагавення скуры, колер твару становіцца шэрым, зямлістым, скура на локцях і каленях робіцца падобнай на грубую шалупайку, з'яўляецца так званая «гусіная скура» , валасы губляюць бляск, становяцца цьмянымі, пазногці — крохкімі. Ранняй прыметай недастатковасці вітаміну А можа быць курыная слепата. Крыніцай вітаміну А з'яўляюцца жаўток курынага яйка, рыба, малако, масла і сыры. Правітамін А — карацін замяняюць зялёная салата, шпінат, зеляніна пятрушкі, морква, земляны арэх, абрыкосы, чорныя парэчкі, таматы і сліўы.

Вітаміны групы В садзейнічаюць адраджэнню клетак, паляпшаюць кровазварот, рэгулююць дзейнасць некаторых гармонаў. Недахоп вітамінаў групы В можа выклікаць алергію, запаленчыя працэсы, экзэму, лушчэнне скуры, перхаць, трэшчыны ў куточках вуснаў. Багатыя на вітаміны групы В дрожджы, хлеб грубага памолу, цыбуля, насенне бабовых раслін, арэхі, яйкі, малочныя прадукты, а таксама свініна, пячонка, ныркі.

Вітамін С (аскарбінавая кіслата). Пры яго недахопе характэрная млявасць, апатыя, хуткая стамляльнасць, кроватачывасць дзяснаў. Гэты вітамін удзельнічае ў рэгуляванні абменных працэсаў арганізма. Багатыя на вітамін С цытрусавыя, а таксама чырвоныя і чорныя парэчкі, суніцы, клубніцы, журавіны, памідоры, салодкі перац, рознае зеляніва, усе гатункі капусты, плады шыпшыны, бульба, асабліва «ў мундзірах».

Вітамін D (супрацьрахітны фактар) адыгрывае вялікую ролю ў фарміраванні касцявога шкілета, рэгулюе абмен кальцыю і фосфару ў арганізме. Патрэба ў вітаміне D забяспечваецца за кошт утварэння яго ў скуры пад уплывам сонечнага святла (ультрафіялетавыя промні). Пры недахопе вітаміну D у дзяцей развіваецца рахіт, у дарослых — размякчэнне касцей. Змяшчаецца ў прадуктах толькі жывёльнага паходжання. Найбольш багатыя на вітамін D рыба, тлушч, пячонка рыбаў, змяшчаецца таксама ў масле, яечным жаўтку, малацэ.

Вітамін Е (такаферол). Спрыяльна дзейнічае на сістэму кровазвароту, яго называюць вітамінам маладосці і ўрадлівасці. Пры недахопе вітаміну Е страчваецца здольнасць да нармальнага выношвання цяжарнасці.

Утрымліваюць вітамін Е зерне, мука грубага памолу (з вотруб'я), парасткі пшаніцы, зерне кукурузы, гарох, усе віды капусты, алей, масла, яечны жаўток.

Бескантрольны прыём вітамінаў у вялікіх дозах і на працягу доўгага часу можа выклікаць з'явы агульнай інтаксікацыі, асабліва гэта датычыцца А і D. Вітамін D з асцярожнасцю варта прызначаць людзям ва ўзросце, бо прэпарат можа садзейнічаць развіццю атэрасклерозу. Пры прыёме вялікай колькасці вітамінаў групы В з'яўляецца бяссонніца, галаўны боль, галавакружэнне, пачашчанае сэрцабіццё. Лячэбная сутачная доза аскарбінавай кіслаты не павінна перавышаць 0,5 г.

У народнай медыцыне існуе мноства рэцэптаў па папярэджанні авітамінозу.

Карысна есці цыбулю-рэпку і зялёныя пёры цыбулі, якія змяшчаюць вялікую колькасць аскарбінавай кіслаты. Рэкамендуецца ўжываць цытрусавыя, есці сырыя ягады і садавіну. Вельмі карысная белакачанная капуста, свежая і квашаная, вадзяныя адвары хвоі. Варэнне з шыпулек.

Прапануецца такі рэцэпт. Дрожджы заліць кіпенем, астудзіць, дадаць крыху цукру і піць 2-3 разы на дзень па паўшклянкі. Атрымаецца смачны асвяжальны напой.

Эфектыўнае прымяненне такой сумесі: узятыя ў роўных суадносінах (па 200 г) сухафрукты: курагу, разынкі, чарнасліў (без костак) змешваюць і здрабняюць у аднародную масу. У яе дадаюць молатыя ядры грэцкіх арэхаў, і ўсё добра перамешваюць. Захоўваць у закаркаваным шкляным посудзе ў халадзільніку. Захоўваецца гэта сумесь да месяца. Прымаць па адной сталовай лыжцы ў дзень, запіваць яе трэба шклянкай кефіру, сыраквашы. Эфект наступае паступова, але ён даволі стойкі.

ВІТАМІННЫЯ ЗБОРЫ:

№ 1: плады шыпшыны — 1 частка, ягады парэчак — 1 частка.

№ 2: плады шыпшыны — 1 частка, плады каліны — 1 частка.

№ 3: плады шыпшыны — 1 частка, ягады бруснічаў — 1 частка.

№ 4: плады шыпшыны — 3 часткі, ягады бруснічаў — 1 частка.

№ 5: плады шыпшыны 3 часткі, ягады чорных парэчак — 1 частка, лісце крапівы — 3 часткі, корань морквы — 3 часткі.

№ 6: плады рабіны — 12 частак, ягады маліны — 2 часткі, лісце чорных парэчак — 2 часткі.

Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 48 38 82, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 880. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12